СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ і І ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	І квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 ЛІСТАПАДА 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 217
(26825)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДПІСАЎ УКАЗ АБ АКАЗАННІ ДАПАМОГІ ПАЦЯРПЕЛЫМ ПРЫ ВЫБУХУ НА «ПІНСКДРЭЎ-ДСП»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 лістапада падпісаў указ № 565 «Аб аказанні матэрыяльнай дапамогі сем'ям (блізкім сваякам) загінулых (памерлых) і асобам, якія пацярпелі ў выніку надзвычайнага здарэння ў сумесным таварыстве з абмежаванай адказнасцю «Пінскдрэў-ДСП». Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Указам прадугледжваецца выплаціць: 1500 базавых велічынь (Br52,5 млн.) — аднаму з членаў сям'і або блізкіх сваякоў загінулага (памерлага); 600 базавых велічынь (Br21 млн.) — людзям, якія атрымалі цяжкія цялесныя пашкоджанні; 300 базавых велічынь (Br10,5 млн.) — людзям, якія атрымалі менш цяжкія цялесныя пашкоджанні.

Брэсцкім аблвыканкамам будзе створана камісія, якая вызначыць памер кампенсацыі зыходзячы са ступені цяжкасці цялесных пашкоджанняў, атрыманых пацярпелымі людзьмі. Усе выплаты пацярпелым будуць ажыццёўлены за кошт сродкаў рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«НІХТО З БЯДОЮ САМ-НАСАМ НЕ ЗАСТАНЕЦЦА»

Пінск жыве пад знакам трагедыі 25 кастрычніка. У горадзе вядзецца расследаванне прычын аварыі на прадпрыемстве «Пінскдрэў-ДСП». Паводле распараджэння дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Леаніда Мальцава, створана камісія, якая павінна назваць прычыны выбуху і пажару. Папярэдняя вынікі работы камісіі чакаюцца ў сярэдзіне лістапада.

Тым часам сем'і загінулых і тых, хто знаходзіцца ў бальніцах, стараюцца падтрымаць сябры, знаёмыя, нават чужыя людзі. Сваім абавязкам гэта рабіць лічаць гарадскія ўлады. І можна сказаць, што сувязным звяном паміж сем'ямі і органамі ўлады стала старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Ніна Кахновіч. Разам са старшынёй гарвыканкама Аляксандрам Гордзічам яны сустрэліся з усімі сем'ямі загінулых і пацярпелых, узялі на заметку іх праблемы. У кожнай з сямей ёсць нумар мабільнага тэлефона Ніны Іванаўны, на які можна пазваніць у любы час.

СТАР. 2

БЕЛАРУСЬ І ПОЛЬШЧА МАЮЦЬ ВЯЛІКІЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ НАЛАДЖВАННЯ БОЛЬШ ЦЕСНЫХ АДНОСІН

Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час інтэрв'ю журналістам польскіх СМІ, перадае карэспандэнт **БЕЛТА**.

«Час упушчаных магчымасцяў мы пражылі. Вядома, мы маглі б мець больш цесныя адносіны, нягледзячы на тое, што вы знаходзіцеся ў Еўрапейскім саюзе і шмат у чым абмежаваны нейкімі рэчамі, нарматыўнымі актамі ЕС. Я гэта разумею. Тым не менш у нас вялізнае поле дзейнасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Няважна, што ў нас няма якіх-небудзь палітычных пагадненняў. Няважна, што ў нас нейкія рознагалоссі, недамоўкі на ўзроўні дзяржслужачых. Граніца паміж Польшчай і Беларуссю не з'яўляецца сцяной», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што дзяржавы вельмі актыўна супрацоўнічаюць.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўскладае вельмі вялікія надзеі на новае кіраўніцтва Польшчы. «Я вельмі вялікія надзеі ўскладаю на тое, што гэта той чалавек, які будзе прынцыпова весці палітыку і адкрыта глядзець на ўсе рэчы», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Звяртаючыся да польскіх журналістаў, ён таксама адзначыў: «Хацелася б, каб вы сваю палітыку будавалі ў адносінах да нас, не толькі атрымліваючы інфармацыю ад апазіцыянераў, а ўсё ж такі самі прыязджалі, вывучалі».

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости»

ИНФОРМИРУЕТ:

Время и дата проведения открытого аукциона по продаже здания административно-хозяйственного с гаражом, литер А 2/К, общая площадь 179,6 кв. м, инвентарный номер 500/С-6313, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 62А (извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.10.2010), **переносятся** с 15.00 15 ноября 2010 года **на 11.00 01 декабря 2010 года.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 18.10.2010 по 29.11.2010 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36.

ПРАКАВЕТНАЕ

НАВАСЕЛЬСКАЯ «СВЯЧА»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Наша «свяча» вельмі старажытная, з пятроўскіх часоў! — кажуць жыхаркі вёскі Наваселле, якія сабраліся на народны хрысціянскі абрад. — Яна выратавала нам жыццё ў вайну.

Гэты абрад больш нідзе не захаваўся, і толькі ў Наваселлі ў Бярэзінскім раёне двойчы на год носяць свечку ад хаты да хаты. На Ушэсце і дзень іконы Казанскай Божай Маці. Учора свечку з абразамі забрала да сябе Раіса Міхайлаўна Белая — чалавек як трагічнага, так і шчаслівага лёсу. І пра яе варта сказаць некалькі слоў.

Раісе было восем гадоў, калі ў яе вёску Узнаж Крупскага раёна на Пакровы ў 1942 годзе прыехалі нямецкія карнікі і расстралялі ўсіх жыхароў — 386 чалавек. Цалкам загінула і сям'я Раісы — бацькі і восем сястрычак. Сама яна ў той час была ў суседняй вёсцы і таму ацалела. Многа гаравала, бадзялася па людзях. Калі ж сама выйшла замуж, дык нарадзіла шэсць дзяцей — пяць дачок і сына.

— У дзецях, унуках і ўнучках, і нават праўнуках сапраўднае шчасце, — прызнаецца Раіса Міхайлаўна. Таму ўжо трэці раз у сваім жыцці бяру «свячу», каб і ў маёй хаце, і ў доме кожнага майго дзіцяці панаваў мір.

Трагічны лёс напаткаў у вайну і вёску Наваселле. Па планах акупантаў, яе жыхароў за сувязь з партызанамі чакаў расстрэл. Але ў час, калі фашысты акружылі вёску і абставілі яе кулямётамі, жыхары пачалі маліцца. Гэта быў дзень іконы Маці Божай Казанскай. Нікога тады не расстралялі. І вось ад таго выпадку, паверыўшы ў вышэйшую справядлівасць, навасельцы аднавілі абрад «свяча», які быў перарваны з-за атэістычных нораваў перадваеннага часу, і ўжо больш ніколі не спынялі яго. Што цікава, жыхароў у вёсцы засталося няшмат, але і дагэтуль існуе вялікая чарга на «свячу». Мо таму і сталі з некаторага часу пераносіць яе нават двойчы на год. У апошнія дзесяць гадоў да свечкі далучыліся і два абразы.

На гэтую «свячу» ў Наваселле прыехалі ўсе дзеці Раісы Белай і колішнія жыхары, якія даўно сталі гарадскімі. Адзін з іх, Фёдар Сіняк, патлумачыў, што калі і засталіся ў вёсцы сапраўдныя святы, дык гэта якраз перанос «свячы». «Свяча» — душа і памяць Навасельля.

На здымку: Раіса Белая, яе 5-гадовы ўнук Мікіта Белы і старэйшая суседка Антаніна Сіняк, якая дзіцем перажыла і памятае навасельскую трагедыю.

Анатоль КЛЯШЧУК.

БЫЛЫ НАЧАЛЬНІК УУС ГРОДЗЕНСКАГА АБЛВЫКАНКАМА ГЕНАДЗЬ ХАЦЬКО З'ЯВІЎСЯ Ў ПРАКУРАТУРУ

Учора былы начальнік упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама, генерал-маёр міліцыі Генадзь Хацько, які быў аб'яўлены ў вышук, добраахвотна з'явіўся да пракурора вобласці. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў старшы памочнік пракурора Гродзенскай вобласці Вячаслаў Ігнацік.

Генадзь Хацько заявіў, што прызнае сябе вінаватым ва ўчыненні злоўжывання службовым становішчам, гатовы кампенсаваць прычыненыя страты і не збіраецца хавацца ад органаў правапарадку. Мера стрымання «заключэнне пад варту» зменена яму на падпіску аб нявыездзе.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Удзельнікам XVII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»
Дарагія сябры!

Шчыра рады вітаць вас на гасціннай беларускай зямлі і павіншаваць з адкрыццём XVII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

З'яўляючыся амаль равеснікам нашай маладой незалежнай дзяржавы, гэты фестываль вельмі добра адлюстроўвае духоўнае аблічча сучаснай Беларусі — як адкрытасць свету, прыхільнасць да агульначалавечых каштоўнасцяў, імкненне да супрацоўніцтва з усімі людзьмі добрай волі.

У тыя цяжкія часы, калі па-жывому рваліся сувязі паміж народамі, мы стварылі «Лістапад», каб захаваць адзіную кінематаграфічную прастору нашых краін, падтрымаць тых майстроў экрана, чые фільмы сцвярджаюць маральныя і эстэтычныя ідэалы, дапамагаюць маральнаму ўзвышэнню асобы і набыццю ўнутранай свабоды.

І з той пары фестываль з гонарам выконвае сваю місію, дэманструе шырыню творчых поглядаў і павагу да нацыянальных традыцый як вялікіх, так і малых народаў, не адступае перад націскам глабалізацыі. Думаю, менавіта гэта стварае ўнікальную атмасферу мінскага кінафоруму, якая так цэніцца ў Беларусі і за мяжой.

Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы і сапраўды ўсенароднай любові наш «Лістапад» з года ў год пашырае свае межы, збірае старых і новых сяброў, прадстаўляе лепшыя ўзоры сучаснага кінематографа і дае магчымасць праявіць сябе маладым талентам.

Не сумняваюся, што сёлетні фестываль падорыць нам шмат яркіх, наватарскіх ідэй, непаўторных вобразаў і эмоцый, дасць магутны імпульс далейшаму развіццю гуманітарнага і культурнага дыялога. А Беларусь і яе сталіца раскрыюцца для сусветнай кінаіндустрыі з пункту гледжання новых магчымасцяў і перспектыў плённага супрацоўніцтва.

Зычу нашаму кінафоруму паспяховай працы, а ўсім вам — моцнага здароўя, натхнення, шчасця і добрага настрою.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Прамая лінія

ЯК ДАПАМАГЧЫ ХВОРЫМ СУСТАВАМ?

Захворванні суставаў сёння настолькі распаўсюджаныя, што іх можна лічыць адной з прыкмет часу. Сярод іх ролю лідара займае астэапароз. Ад чаго ён узнікае? Якія сімптомы гэтага захворвання? Як яго лячыць і ў чым заключаецца прафілактыка хваробы?

Пра гэта мы пагаворым на чарговай «прамой лініі». У ёй возьме ўдзел кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра метабалічных астэапатый і астэапарозу, дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук Ала Пятроўна Шапялькевіч.

«Прамая лінія» адбудзецца сёння з 15.00 да 16.00 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.

ПАДАТКОВЫЯ ВЫЛІКІ БУДУЦЬ ПРАДАСТАЎЛЯЦЦА І ПА МЕСЦЫ НЕАСНОЎНАЙ РАБОТЫ

У наступным годзе ў краіне пачнуць дзейнічаць дапаўненні і змяненні ў Падатковым кодэксе, Закон аб якім быў прыняты днямі

Пра змены ў падатковым заканадаўстве паведаміла на брыфінгу Міністэрства па падатках і зборах начальнік галоўнага ўпраўлення метадалогіі падаткаабкладання арганізацый Лідзія ЦЫБІНА.

У першую чаргу гэта адмена двух мясцовых падаткаў: збор на паслугі і адлічэнні на развіццё тэрыторый. Са складу экалагічнага падатку выключаюцца тры плацяжы. У наступным годзе змяняюцца падыходы па вылічэнні падатку на прыбытак: дэкларацыя падаецца раз у год, а плата падатку ажыццяўляецца раз у квартал. Тэрміны платы авансавых плацяжоў падатку на прыбытак у 2011 годзе вызначаны кодэксам паквартальна: да 22 сакавіка, 22 чэрвеня, 22 верасня і 22 снежня. Па выбары плацельшчыкаў прапануецца два метады авансавых плацяжоў: або выходзячы з адной чвэрці фактычных вынікаў дзейнасці за 2010 год, або выходзячы з планаванай сумы падатку на прыбытак, аднак не менш за 80 працэнтаў ад аб'ёму такіх плацяжоў у 2010 годзе.

Па падатку на дабаўленую вартасць з наступнага года адменены бягучыя авансавыя плацяжы і акцызныя адлічэнні. У 2011 годзе для арганізацый пашыраецца права плацельшчыкаў выкарыстоўваць падатковыя вылікі па лініі капітальных укладанняў. Да апошняга часу такі вылік у поўным аб'ёме маглі ажыццяўляць толькі падаткаплацельшчыкі з нулявой падаткоавй стаўкай. У наступным годзе такія падатковыя вылікі па капукладаннях будуць выкарыстоўваць і арганізацыі, якія не маюць экспартнай выручкі.

З першага верасня ўказам № 420 унесены змены па стаўках зямельнага падатку, якія зараз будуць амаль напрамую залежаць ад кадастравага кошту зямлі. Гэтыя прынцыпы фарміравання стаўкі зямельнага падатку зацверджаны і ў Падатковым кодэксе.

Днямі спецыялісты МПЗ падрыхтавалі праект пастановы міністэрства, дзе прадугледжваецца паменшыць колькасць формаў падатковых дэкларацый на 8 адзінак. Акрамя гэтага, у саміх дэкларацыях істотна паменшаецца аб'ём даведачнай інфармацыі аб падаткаплацельшчыках.

Аб новаўвядзеннях па падаходным падатку для насельніцтва ў новым годзе паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Галіна РАДЗЮКЕВІЧ. Паводле яе слоў, у 2011 годзе павялічваецца стандартны падатковы вылік з 270 да 292 тысяч рублёў, калі работнік атрымлівае даход да 1 млн 766 тысяч рублёў. Сёлета верхняя планка такога даходу складала 1 млн 635 тысяч рублёў. На кожнае дзіця ў наступным годзе падатковы вылік складзе 81 тысячу рублёў (цяпер — 75 тысяч рублёў). Для катэгорыі работнікаў, якія атрымліваюць падатковыя вылікі ў двайным памеры (гэта адзінокія бацькі, удовы, удаўцы, шматдзетныя сем'і), стандартны вылік павялічыўся са 150 да 162 тысяч рублёў. Акрамя гэтага, **адзінокімі бацькамі будуць лічыцца цяпер і тыя, у каго жонку ці мужа пазбавілі бацькоўскіх правоў.**

Прыемную навіну паведаміла спадарыня Радзюкевіч для тых падаткаплацельшчыкаў, якія маюць некалькі месцаў работы. Пачынаючы з 2011 года, плацельшчыкі падаходнага падатку атрымліваюць права на сацыяльна-маёмасны вылік па даходах, атрыманых і па месцы неасноўнай работы. Гэты вылік будзе прадастаўляцца пасля падачы падатковай дэкларацыі ў падатковыя інспекцыі.

У 2011 годзе ўстанаўліваецца новы падатковы вылік па лініі платнага адчужэння (продажу) асабістай маёмасці. Вядома, што пры продажы аб'ектаў нерухомасці, аўтамабіляў і іншай маёмасці бываюць выпадкі, калі дакументы аб кошце іх набыцця не захаваліся. У гэтых выпадках падаходная база для падаткаабкладання, атрыманых даходаў ад рэалізацыі маёмасці памяншаецца на 10 працэнтаў. Такі механізм падатковых вылікаў можа выкарыстоўвацца і пры продажы каштоўных папер.

У наступным годзе ад падаткаабкладання вызваляюцца даходы грамадзян, якія атрымліваюцца па лініі кампенсацыі маральнай шкоды.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Рэйтынг самых уплывовых людзей свету: Пуцін чацвёрты, а Мядзведзева няма нават у дзясятку

Часопіс Forbes склаў штогадовы спіс самых уплывовых людзей планеты. Першае месца дасталася старшыні КНР Ху Цзіньтао. Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін заняў у рэйтынгу чацвёртае месца, а прэзідэнт Дзмітрый Мядзведзеў, што характэрна, не ўвайшоў нават у першую дзясятку — яму дасталася толькі 12-е месца. Трэцяга расіяніна, які ўвайшоў у спіс, віцэ-прэм'ера Ігара Сечына называе рускім «Дартам Вэйдарам» і запэўнівае, што на радзіме яго баяцца як «самага страшнага чалавека на Зямлі».

Самым магутным у свеце выданне прызнала Ху Цзіньтао, паколькі ён кіруе пятай часткай насельніцтва планеты (1,3 мільярда чалавек) і другой пасля ЗША эканомікай свету. За ім ідзе прэзідэнт ЗША Барак Абама, а на трэцім месцы ў рэйтынгу Forbes — кароль Саудаўскай Аравіі Абдала бін Абдэль Азіз, піша РІА «Навіны».

Таксама ў Топ-10 апынуліся папа Рымскі Бенядыкт XVI, канцлер Германіі Ангела Меркель, брытанскі прэм'ер Дэвід Кэмеран, кіраўнік ФРС ЗША Бэн Бернанке, лідар кіруючай у Індыі партыі Соня Гандзі і заснавальнік Microsoft Біл Гейтс.

МВФ прадказаў рэзкае замаруджванне росту сусветнай эканомікі

Міжнародны валютны фонд зменшыў свой прагноз росту сусветнай эканомікі ў бягучым і наступным годзе да 3-4 працэнтаў. Пра гэта заявіў галоўны эканаміст фонду Аліўе Бланшар, паведамляе AFP. Раней фонд чакаў росту на 4,8 працэнта ў 2010 годзе і 4,2 працэнта ў 2011-м.

Бланшар дадаў, што тэмпы росту ВУП у розных эканоміках будуць моцна адрознівацца. У краінах у стадыі развіцця варта чакаць уздыму на 6-8 працэнтаў ці нават больш, тады як у развітых — толькі на 1-2 працэнты. Галоўны эканаміст МВФ таксама пахваліў рашэнне Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША ўліць у эканоміку краіны дадатковыя 600 мільярдаў долараў пры дапамозе скупкі дзяржаблігацый. Пры гэтым ён заўважыў, што наступствы такіх дзеянняў могуць быць негатыўнымі для эканомікі Еўропы, а таксама краін у стадыі развіцця, якія сутыкаюцца з праблемай прытоку «гарачых» грошай.

У ліпені 2010 года МВФ перагледзеў прагноз росту сусветнай эканомікі ў бок павелічэння. Аднак з тых часоў у найбуйнейшых краінах свету была адзначана тэндэнцыя да сур'ёзнага запаволення росту ВУП. Акрамя таго, у ЗША і некаторых краінах еўразоны існуе верагоднасць паўторнай рэцэсіі.

Аўстралійская авіякампанія паспяшалася з крушэннем Airbus A380

Самалёт аўстралійскай авіякампаніі Qantas з 433 пасажырамі і 26 членамі экіпажа на борце здзейсніў экстранную пасадку ў Сінгапуры, пазбавіўшыся ў небе аднаго з рухавікоў, паведамляе Reuters: па некаторых звестках, рухавік папросту адваліўся. Ніхто з людзей не пацярпеў, адзначаюць у міністэрстве замежных спраў Аўстраліі.

У авіякампаніі, аднак, паспелі паведаміць, што авіялайнер Airbus A380, які ляцеў з Сінгапура ў Сіднэй, разбіўся неўзабаве пасля вылету. Прыводзіліся нават сведчанні відавочцаў, якія нібы бачылі выбух у небе. Паведамленне было тут жа падхоплена і растыражавана інфармацыйнымі агенцтвамі. На шчасце, гэта інфармацыя не пацвердзілася: лётчыкі на трох рухавіках, якія засталіся, паспяхова вярнуліся ў аэрапорт.

«У НАС АГУЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ І АГУЛЬНАЯ БУДУЧЫНЯ»

ЗАЯВІЎ КІРАЎНІК АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ УЛАДЗІМІР МАКЕЙ ПАДЧАС СВАЙГО ВЫСТУПЛЕННЯ НА АДКРЫЦЦІ МІНСКАГА ФОРУМУ, ЯКІ ЎЖО Ў ТРЫНАЦЦАТЫ РАЗ ПРАХОДЗІЦЬ У БЕЛАРУСКАЙ СТАЛІЦЫ

Мінскі форум — буйная міжнародная канферэнцыя, на якой абмяркоўваюцца надзённыя для нашай краіны палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і грамадскія праблемы. Сёлета тэма форуму была прысвечана стану адносін Беларусі і ЕС пасля крызісу. Тры дні работы форуму былі насычаныя дыскусіямі, спрэчкамі, сутыкненнямі пазіцый і меркаванняў і г. д. Высокі дыскусійны тон надалі выступленні кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзіміра Макея і федэральнага міністра па асобых даручэннях, дэпутата бундэстага, кіраўніка ведамства канцлера Рональда Пафала. Дарэчы, упершыню на форум прыехаў дзейны федэральны міністр ФРГ. Удзел гэтых палітыкаў, безумоўна, выклікаў павышаную цікавасць да форуму — у ім удзельнічала каля 500 прадстаўнікоў з 22 краін.

Сёлета ў цэнтры ўвагі Мінскага форуму знаходзіліся таксама і ход рэалізацыі праграмы «Усходняе партнёрства», няпростыя адносіны нашай краіны з Расіяй, дыверсіфікацыя і мадэрнізацыя беларускай эканомікі, пытанні адукацыі, супрацоўніцтва ўніверсітэтаў і інш. Карацей, цэлы спектр праблем, якія можна вырашыць толькі пры зацікаўленым падыходзе абодвух бакоў. Сваімі поглядамі на праблематыку адносінаў Беларусі і ЕС падзяліўся Уладзімір Макей, які адзначыў, што форум заўсёды быў пляцоўкай для дыялогу па актуальных пытаннях, а тым больш сёння, калі яго работа праходзіць у знаковы палітычны момант.

З Еўропай, па словах Уладзіміра Макея, у нас агульныя каштоўнасці і агульная будучыня. Мы павінны разумець гэта і павінны прыйсці да гэтага разумення ўсвядомлена. На яго думку, сёння ёсць унікальны шанц для вываду адносінаў Беларусі і ЕС на якасна новы ўзровень. Але гэтаму руху, паводле меркавання прамоўцы, яшчэ перашкаджаюць замшэлыя стэрэатыпы, спробы размаўляць з Беларуссю на мове санкцый, забарон і ізаляцыі. На жаль, пакуль яшчэ не да канца атрымалася пазбавіцца ад элементаў такога мыслення, сказаў Уладзімір Макей. Разам з тым ён адзначыў, што сёння няма сэнсу шукаць вінаватых ва ўпушчаных магчымасцях, а варта засяродзіцца на рэалізацыі таго велізарнага патэнцыялу, які існуе ў адносінах паміж Беларуссю і Еўрасаюзам. І гэты працэс ужо пачаўся. У прыватнасці, наша краіна падтрымала ініцыятыву Еўрасаюза «Усходняе партнёрства», паступова наладжваецца палітычны дыялог, назіраюцца зрухі і кантакты ў многіх сферах дзейнасці.

Уладзімір Макей, між іншым, заўважыў, што нас дагэтуль папракаюць у тым, што краіна недастаткова дэмакратычная, не адпавядае агульнаеўрапейскім каштоўнасцям і што назіраецца рэгрэс у адносінах з Еўрасаюзам. На яго погляд, «гэта ў пэўнай меры безадказныя заявы». Бо дынаміка працэсаў у Беларусі ва ўсіх сферах дазваляе канстатаваць, што за апошнія два гады ажывіўся наш дыялог з Еўропай, у цэлым адбыліся сур'ёзныя змены. Гэта ўсяляе аптымізм у неабходнасці наступнага развіцця ўсебаковага дыялогу, супрацоўніцтва і паўнацэннага далучэння Беларусі да агульнаеўрапейскіх працэсаў.

Што датычыцца нямецкага палітычнага досведу, то ён сёння асабліва запатрабаваны ў Беларусі. У прыватнасці, ключавым момантам кампаніі па правядзенні ў Беларусі прэзідэнцкіх выбараў і нават беларускай стратэгіяй Уладзімір Макей назваў ідэю «дабрабыту для ўсіх», аўтарам якой стаў вядомы эканаміст і былы федэральны канцлер Людвіг Эрхард.

Уладзімір Макей падкрэсліў, што Беларусь рабіла і будзе рабіць свой важкі ўнёсак у забеспячэнне сацыяльна-палітычнай стабільнасці і энергетычнай бяспекі Еўропы, барацьбу з міжнароднай арганізаванай злачыннасцю, нелегальнай міграцыяй. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта запэўніў удзельнікаў форуму ў тым, што курс беларускага кіраўніцтва на рэформы нязменны. Ні пра які рэгрэс з нашага боку ў пабудове дыялогу з Еўрасаюзам размова не ідзе. Праводзіцца планамерны рух у кірунку мадэрнізацыі і дэмакратызацыі грамадства. Таму Беларусь мае права чакаць ад Еўрасаюза больш канструктыўных крокаў. Гэта і спрашчэнне візавага рэжыму, канчатковая адмена санкцый, распрацоўка пашыранай дамовы аб партнёрстве і супрацоўніцтве. Бо будаўніцтва адзінай дэмакратычнай, бяспечнай і стабільнай Еўропы без нашай краіны будзе як мінімум незавершаным, лічыць Уладзімір Макей.

Ён таксама закрануў тэму прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Пры гэтым заўважыў, што некаторыя замежныя партнёры займаюць пазіцыю чакання: маўляў, спачатку трэба дачакацца вынікаў выбараў, а потым думаць, як развіваць адносіны з Беларуссю. На думку прамоўцы, не трэба паўтараць ранейшыя памылкі, а лепш вучыцца на іх. Кіраўніцтва Беларусі само, як ніхто іншы, зацікаўленае ў правядзенні адкрытых і празрыстых выбараў, заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Цікавым, змястоўным, хоць і небясспрэчным было выступленне міністра Рональда Пафалы, які спецыяльна прыехаў для ўдзелу ў Мінскім форуме. Пасля сваёй прамовы на адкрыцці форуму Рональд Пафала разам з Уладзімірам Макеем удзельнічалі ў подыум-дыскусіі. Яны правялі і двухбаковую сустрэчу, тэмамі якой былі сітуацыя ў Беларусі, яе адносіны з Германіяй і Еўрапейскім саюзам. Рональд Пафала таксама правёў сустрэчы з прадстаўнікамі апазіцыі.

На наступны дзень Рональд Пафала даў прэс-канферэнцыю, падчас якой ён адзначыў шчыры і зацікаўлены характар перамоў з Уладзімірам Макеем. Вядома, Рональд Пафала не мог абысці тэму прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. На пытанне журналістаў, ці раіў Рональд Пафала апазіцыйным прэтэндэнтам на ўдзел у выбарах вызначыць са свайго асяроддзя аднаго кандыдата і зрабіць на яго стаўку ў далейшай барацьбе за пасаду прэзідэнта, міністр адказаў, што такіх рэкамендацый не даваў. Па яго словах, такія парады былі б глупствам, а наяўнасць некалькіх кандыдатаў адпавядае прынцыпам свабодных выбараў.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

КРЫЖА НА ІМ НЯМА

Можа, таму рабочы аднаго з мазырскіх прадпрыемстваў спакусіўся на нацельныя крыжыкі, якія выкраў з царквы ў гонар уводзінаў у храм Прасвятой Багародзіцы? Акрамя іх, 21-гадовы грамадзянін, выставіўшы аконную раму ў будынку, прыхапіў свечкі, царкоўныя календары і больш за 350 тысяч рублёў. Начны здабытак злодзея вернуты ў храм.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Скандал

АЛІМПІЙЦАЎ АДПРАЎЛЯЮЦЬ ЛЯЧЫЦЦА Ў ЗВЫЧАЙНУЮ ПАЛІКЛІНІКУ

Рэспубліканскі цэнтр спартыўнай медыцыны, дзе аказваюць дапамогу ўсім найлепшым беларускім спартсменам, высяляюць на першы паверх жылога дома ў Лошыцы. На старой тэрыторыі цэнтра збіраюцца паставіць гатэль.

У рэдакцыю «Звязды» трапіла адкрытае пісьмо ад спартсменаў і ўрачоў: «Гэта прывядзе да правалу на Алімпіядзе ў Лондане і падрыву спартыўнай медыцыны ў нашай краіне!» .

Чаму эліта беларускага спорту можа застацца без належнай медыцынскай дапамогі? У гэтым пытанні разбіраўся наш журналіст.

СТАР. 7

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЧПУП «Стародорожский кооппром» (продавец)

проводит очередной открытый аукцион по продаже объектов недвижимости, расположенных по адресу: **Минская область, Стародорожский район, д. Новины**, в составе:

Лот № 1: здание откормочного пункта КРС, об. пл. 938,8 кв.м.

Начальная цена с НДС – 6 176 000 бел. руб.

Лот № 2: здание свинооткормочного пункта, об. пл. 1096,8 кв.м.

Начальная цена с НДС – 9 798 000 бел. руб.

Лот № 3: здание свинарника-маточника, об. пл. 525,2 кв.м.

Начальная цена с НДС – 9 421 000 бел. руб.

Лот № 4: здание кормоцеха, об. пл. 136 кв.м.

Начальная цена с НДС – 1 382 000 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.09.2009.

Аукцион состоится **12.11.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.11.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

ISSN 1990 - 763X

ВЫЛУЧЭННЕ ДЭЛЕГАТАЎ УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ ЗАВЯРШАЕЦЦА Ў МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

паведамілі **БЕЛТА** ў галоўным упраўленні арганізацыйна-кадравай работы Мінскага аблвыканкама.

Першы сход упаўнаважаных прайшоў у сталічным рэгіёне яшчэ 27 кастрычніка. Тады ў Валожыне сабралася каля 180 прадстаўнікоў ад працоўных калектываў, грамадскіх аб'яднанняў, грамадзян па месцы жыхарства, якія выбралі 10 найбольш дастойных кандыдатаў. Такія сходы адбыліся 2-4 лістапада практычна ва ўсіх раёнах вобласці, за выключэннем Вілейскага, дзе мерапрыемства запланавана на 5 лістапада.

Сёння вызначаліся з удзельнікамі Усебеларускага народнага сходу Бярэзінскі, Дзяржынскі, Клецкі, Мінскі, Маладзечанскі, Стаўбцоўскі, Салігорскі раёны. На сходах былі заслуханы даклады кіраўнікоў раёнаў аб сацыяльна-эканамічным развіцці. У сходзе ўпаўнаважаных у Салігорску прыняў удзел старшыня Мінаблвыканкама Барыс Батура, ад горада шахцёраў выбрана 34 дэлегаты.

Мінская вобласць дэлегуе на Усебеларускі народны сход 350 прадстаўнікоў. Такая квота на ўдзел вызначана сталічнаму рэгіёну згодна з указам № 531. Колькасць дэлегатаў ад адміністрацыйных адзінак залежыць ад колькасці пражываючых на тэрыторыях паўналетніх грамадзян.

Чацвёрты Усебеларускі народны сход пройдзе ў Мінску 6-7 снежня. Ён склікаецца з мэтай рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян удзельнічаць у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця. На абмеркаванне Усебеларускага народнага сходу выносяцца пытанні аб вынікаў рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006-2010 гады і аб асноўных палажэннях Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011-2015 гады. У сходзе прымуць удзел 2,5 тыс. чалавек.

«НІХТО З БЯДОЮ САМ-НАСАМ НЕ ЗАСТАНЕЦЦА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Бо ў такой бядзе людзі нават, здаралася, губляліся, ім была патрэбна звычайная парада. Так было з адной маладой жанчынай. Яна патэлефанавала Ніне Кахновіч а дванаццатай гадзіне ночы і сказала: «Ніна Іванаўна, ён памёр... Што мне рабіць?». І Ніна Іванаўна адказала: «Пакуль — проста паплачце. А пра арганізацыю пахавання не думайце, усё зробіць прадпрыемства».

— Спачатку трэба было дастойна пахаваць людзей, падтрымаць у гэты час іх блізкіх, — расказвае старшыня гарсавета. — А потым брацца за вырашэнне іх праблем. У некаторых узнікла патрэба тэрмінова ўладкоўвацца на працу альбо мяняць яе месца. Так, адну жанчыну, якая працавала педагогам у раёне і ездзіла на працу кожны дзень, перавялі ў адзін з дзіцячых садкоў горада. Уладкавалі на працу маці аднаго з загінулых. У адной сям'і сын заканчвае вучобу ў сталічным універсітэце. Хлопец меў намер застацца ў Мінску, але цяпер ён пажадаў прыехаць у Пінск, каб падтрымліваць маці, і яму будзе знойдзена месца працы тут. Многім спатрэбілася медыцынская дапамога: стрэс і гора, што навалілася знянацку, абвастрылі хранічныя захворванні, дадалі новых. Бацька аднаго з загінулых, жыхар Столінскага раёна, ужо шпіталізаваны ў райбальніцу. Усе сем'і па чарзе наведваюць участковыя дактары, і высвятляецца, што некаторым патрэбна лячэнне ў стацыянары. Яно паступова арганізоўваецца.

Галоўнае, — дадае Ніна Іванаўна, — што мы збіраемся не абмяжоўвацца цяперашняй дапамогай, а ўсяляк падтрымліваць гэтыя сем'і і надалей. Так сталася, што ўсе, хто загінуў і пацярпеў, былі добрымі працаўнікамі, прыстойнымі людзьмі, апорамі ў сем'ях. Са стратай некаторых сем'і страцілі асноўныя карміцеляў. Таму жонкам, дзецям, бацькам патрэбна ўсяляк дапамагчы.

На афіцыйным сайце Пінскага гарвыканкама змешчаны спіс 14 чалавек, якія загінулі, і тых шасці, хто застаецца ў бальніцах. На сайце холдынгавай кампаніі «Пінскдрэў» паведамляецца, што назіральны савет кампаніі прыняў рашэнне аказаць дадатковую матэрыяльную дапамогу — сем'ям загінулых — па 30 мільёнаў рублёў, пацярпелым — па 20 мільёнаў. З улікам таго, што было выплачана, а таксама страховак агульныя сумы выплат наблізяцца да 100 мільёнаў рублёў сем'ям загінулых і палавіну гэтай сумы тым, хто пацярпеў.

Не застаецца ўбаку і грамадскасць Пінска. Некаторым аказваецца адрасная дапамога. Так, пінскі футбольны клуб «Хваля» правёў на мясцовым стадыёне матч з камандай са Смаргоні, а грошы ад продажу білетаў перадаў сям'і Яўгена Рапуты. Яўген загінуў, пакінуў маленькага сына, які хварэе і мае патрэбу ў перыядычным лячэнні.

Пры храме Святой Варвары ў Пінску адкрыты дабрачынны рахунак: **«Пріорбанк» ЦБУ 506 г. Пінск, код 153001749, УНП 200320085 р/р 3015520162218**, на які можна пералічваць грошы. І першыя ўнёскі ад прадпрыемстваў, арганізацый, бізнэсменаў ужо паступілі. Потым царкоўная абшчына разам з гарадскім Саветам дэпутатаў створаць камісію, каб размеркаваць гэтыя сродкі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць з прычыны трагічнай гібелі **работнікаў СТАА «Пінскдрэў-ДСП»** і выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім загінулых.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту пратакольнага аддзела Упраўлення арганізацыйнай работы **Садоўскай Ірэне Васільеўне** ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — **смерцю БАЦЬКІ**.

ЗНОЙДЗЕНЫ АСТАНКІ 37 НЯМЕЦКІХ САЛДАТ

Пахаванне часоў Вялікай Айчыннай вайны было знойдзена пры правядзенні раскопак спецыялізаваным вышуковым батальёнам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь ў вёсцы Парычы Светлагорскага раёна. У магіле знаходзіліся астанкі 37 нямецкіх салдат — пры іх былі адпаведныя асабістыя жэтоны. Як расказаў памочнік пракурора Светлагорскага раёна Аляксей Скачынскі, выказваецца меркаванне, што пахаванне адносіцца да 1944 года. Больш дакладныя звесткі, магчыма, з'явяцца пасля правядзення адпаведнай крыміналістычнай экспертызы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Выбары-2010

ПРАЙШЛІ ПА КОНКУРСЕ

З кандыдатурамі тых, хто будзе лічыць галасы на прэзідэнцкіх выбарах, вызначыліся. На 6346 участках задзейнічаюць 70 815 чалавек. Абраныя з больш чым 84 тыс. прэтэндэнтаў, яны вытрымалі конкурс у сярэднім 1,2 чалавека на месца. І ў большасці сваёй гэта не лічыльнікі, а... лічыльніцы! Жанчын у камісіях 68 з лішкам адсоткаў, як паведамляюць у Цэнтрвыбаркаме. Дзяржаўных службоўцаў значна менш, чым дапускае закон — 4,5 адсотка (а магла б быць адна трэць). А прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў і партый больш за належны мінімум — амаль 42 адсоткі.

Унёсак палітычных партый, чаго ўжо тут тушавацца, мізэрны: толькі 2,5 адсотка. Праўда, не быў бы ён істотна большым нават і тады, калі б уключылі абсалютна ўсіх — доля вылучаных складала 3,4 і ўсё роўна раставала ў агульнай масе. Як бы там ні было, удзел у падліку галасоў возьмуць 545 прадстаўнікоў КПБ (77,3% ад вылучанага складу), 428 дэлегатаў ад Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці (91,5% вылучаных), 406 пасланнікаў Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі (96,7% вылучэнцаў), 144 упаўнаважаныя Беларускай аграрнай партыяй (амаль 98% прэтэндэнтаў), 78 прыхільнікаў Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» (27,8% тых, хто ўдзельнічаў у адборы), 63 удзельнікі Рэспубліканскай партыі (92,6% удзельнікаў «кастынгу»), 54 дзеячы Аб'яднанай грамадзянскай партыі (10,7% ад колькасці накіраваных партыяй), 36 прадстаўнікоў партыі БНФ (17,3% вылучаных кандыдатур), 10 асобаў ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) — 20,8% «намінаваных», і пяцёрка ад партыі «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада» (17,2% прапанаваных). 10 з 15 наяўных у краіне партый. Як бачым, найбольш лаяльнымі былі мясцовыя ўлады да кандыдатур ад Беларускай аграрнай партыі, найменш пашанцавала АГП.

Аднак прагрэс у параўнанні з папярэднімі прэзідэнцкімі выбарамі ёсць, адзначаюць у ЦВК.

— Колькасць прадстаўнікоў палітычных партый, уключаных у склад камісій, павялічылася больш чым у 16 разоў, — канстатуе выбарчую прагрэсію сакратар Цэнтральнай камісіі Мікалай ЛАЗАВІК і адзначае, што прычынай таму сталі нядаўнія змены ў выбарчым заканадаўстве.

Прэзентатыўнасць грамадскіх аб'яднанняў у камісіях вырасла амаль у чатыры разы з апошніх выбараў. Самымі прадстаўнічымі сёлета будуць дэлегацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Беларускага саюза жанчын і «Белай Русі». 20 адсоткаў — прадстаўнікі працоўных калектываў, крыху больш за 38 адсоткаў — грамадзяне, вылучаныя шляхам падачы заяў.

Натуральна, незадаволеныя фарміраваннем камісій будуць. Тыя, хто не прайшоў па конкурсе. Аднак у Цэнтрвыбаркаме не лічаць гэта нагодай, каб угледзець парушэнне выбарчага заканадаўства.

— Я не сумняваюся, што тыя людзі, якія не ўвайшлі ў склад выбарчых камісій, не менш вартыя, чым тыя, хто быў уключаны. Аднак на 13 месцаў у камісіі нельга пасадзіць 14 чалавек, — разводзіць рукамі сакратар ЦВК.

Ён нагадвае, што пры гэтым галоўныя патрабаванні выбарчага заканадаўства выкананыя (не менш за трэць прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў і не больш за трэць дзяржаўных службоўцаў). А значыць, «гаварыць пра тое, што камісіі сфарміраваныя несправядліва, не даводзіцца». Безагаворачнай перавазе грамадскіх аб'яднанняў над партыямі (39,3% супраць 2,5%) сакратар ЦВК таксама знаходзіць лагічнае тлумачэнне:

— 15 палітычных партый у агульнай колькасці налічваюць каля 70 тыс. чалавек. І пры гэтым адна толькі Федэрацыя прафсаюзаў налічвае каля 4 млн чалавек. У рэспубліканскай моладзевай арганізацыі — сотні тысяч удзельнікаў. Вельмі шырокія слаі насельніцтва аб'яднаныя таксама ў жаночыя, ветэранскія арганізацыі. Натуральна, яны пераважаюць і ў камісіях.

Тым часам выбаркамы іншага ўзроўню — тэрытарыяльныя — правяраюць сапраўднасць подпісаў, здадзеных прэтэндэнтамі ў прэзідэнты. Не пазней за 13 лістапада вынікі апынуцца ў ЦВК. Пажывём — пабачым...

Зоя ВАРАНЦОВА.

Прадметы даўніны знайшоў віцябчанін Леанід Свецік. На месцы земляных работ па вуліцы Калініна ён знайшоў дзве медныя лыжкі, некалькі старадаўніх манет, аптэкарскі посуд, кавалкі Кузняцоўскага фарфору, бронзавую спражку і іншае. Усе яны канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя.

На здымку: прадметы даўніны, якія сабраў Леанід СВЕЦІК.
Фота БЕЛТА.

НЕМЦЫ НАВУЧАЦЬ ВЫРАБЛЯЦЬ БІЯГАЗ

У Магілёве працуе дэлегацыя нямецкіх дзелавых колаў. У цэнтры ўвагі прадстаўнікоў нямецкіх фірмаў — альтэрнатыўная энергетыка.

— Нас найбольш цікавяць праекты, звязаныя з эканоміяй энергіі і рэсурсаў, біятэхналогіямі, — сказаў нямецкім гасцям **першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ**. — Мы яшчэ толькі ў пачатку шляху, а ў Германіі назапашаны дастаткова вялікі вопыт па гэтых напрамках.

У прыватнасці, у вобласці актыўна цікавяцца нямецкімі тэхналогіямі вытворчасці біягазу. Напрыклад, біягазавы комплекс ствараецца ў сельскай гаспадарцы «Рассвет» Кіраўскага раёна. Увогуле менавіта атрыманнем біягазу з розных бытавых, сельскагаспадарчых і прамысловых адходаў цікавяцца многія арганізацыі ў розных галінах.

— Я выхадзец з Усходняй Германіі, — паведаміў **дырэктар Fancy-import Іахім РАЙХЕЛЬ**. — Назва маёй фірмы прымусіць вас усміхнуцца. Пасля падзення Берлінскай сцяны я вазіў мяккія цацкі вядомай фірмы да вас, у Беларусь. А сёння мы вядзём разведку сітуацыі на беларускім рынку для буйных партнёраў, якія распрацоўваюць праекты біягазавых установак, вытворчасці паліўных гранул і пялетаў, ператварэння сонечнай энергіі.

— Мы ведаем, што ўжо ў недалёкай будучыні ў Беларусі 30% энергіі будуць атрымліваць з мясцовых паліўных крыніц і аднаўляльных крыніц энергіі, — сказаў **прадстаўнік Федэральнага міністэрства эканомікі і тэхналогій Вольфганг ГЕРСТМАН**. — Вам спатрэбіцца мадэрнізацыя энергетычнай галіны: час садзіцца за стол перамоў прадстаўнікам фірмаў.

Таму ў Магілёве адбылася кантактна-кааперацыйная біржа, дзе можна было шукаць партнёраў у канкрэтных праектах. Да таго ж Магілёўская вобласць прапанавала немцам ацаніць сваё выгаднае геаграфічнае становішча — блізкасць да расійскага рынку, а таксама ўважлівае стаўленне мясцовых уладаў да інвестыцыйных праектаў з удзелам замежнікаў.

Ілона ІВАНОВА.

ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА ХАКЕІ-2014: ПАГЛЯДЗЕЦЬ ЗА КУЛІСЫ

У 2014 годзе ў Мінску пройдзе чэмпіянат свету па хакеі. І хоць да спартыўнага спаборніцтва яшчэ чатыры гады, журналісты Першага канала ў шапку не спяць.

Здымачная група Агенцтва тэленавін паставіла перад сабой задачу наведаць краіны, якія неўзабаве прымуць (альбо ўжо прынялі) у сябе чэмпіянат свету па хакеі. «Пункт адліку» — так гучыць сумесны праект Белтэлерадыёкампаніі, Прэзідэнцкага спартыўнага клуба і Федэрацыі хакея Беларусі. Кожны год тэлегледачам будзе прапанаваны адмысловы фільм пра кожную з краін-арганізатараў — Германію, Славакію, Фінляндыю і Швецыю. Першай стане стужка пра Германію.

— Уся работа, якую мы зрабілі, дала нам, па сутнасці, эксклюзіўныя кадры, — прызнаецца «Звяздзе» аўтар праекта «Пункт адліку», вядучы спартыўных навін Першага канала Дзмітрый Анісавец. — Практычна ўсюды перад намі адкрывалі дзверы і давалі зялёнае святло. Гэта дазволіла нам здымацца ў распранальнях, кабінеце допінг-кантролю, судзейскіх. Наша здымачная група складалася з 5 чалавек. Цудоўным чынам была арганізавана падрыхтоўчая праца, у якой дапамаглі нашы партнёры — Федэрацыя хакея і Прэзідэнцкі спартыўны клуб. Неабходны матэрыял мы знялі за 25 дзён.

Акрамя серый з замежжа, для гледачоў штогод будзе рыхтавацца па адной серыі і пра беларускую сталіцу. Фільм распавядае пра тое, якім чынам ідзе падрыхтоўка Мінска да топ-турніру. У тэлеэфіры Першага канала фільм «У Германію за вопытам» паказалі 30 кастрычніка, другая яго частка — «Позірк за кулісы» — 6 лістапада, «Мінск-2010» гледачы пабачаць 13 лістапада.

Ілья ЛАПАТО.

Ну і ну!

НЕЗАКОННЫ МІЛЬЯРД

Спачатку года некалькі мінчан умудрыліся наладзіць даходную справу, праўда, у абход закону, і «зарабіць» на гэтым 1 мільярд рублёў, які ў рэшце рэшт прадпрымальным асобам вылез бокам...

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, падазроныя займаліся незаконнымі фінансавымі аперацыямі. А дзейнічалі яны ад імя і з выкарыстаннем рэквізітаў, пячатак, разліковых рахункаў падкантрольных камерцыйных структур. Трэба заўважыць, што так званыя «бізнэсмены» дзейнічалі, папярэдне аб'яднаўшыся ў кіраванную ўстойлівую групу. У дачыненні да яе ўдзельнікаў Дэпартаментам фінансавых расследаванняў КДК распачата крымінальная справа. Таксама крымінальная справа заведзеная ў дачыненні да жыхара Дзяржынска, які без дзяржаўнай рэгістрацыі ажыццяўляў незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць па набыцці і рэалізацыі жылых дамоў у Мінскай вобласці. Гэтаму падазронаму, які «замацаваўся» на жыллёвым рынку, удалося ў 2006-2008 гадах атрымаць даход у суме больш як 137 мільёнаў рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.11.2010 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	3 020,00	1 чэшская крона	175,46
▼ 1 еўра	4 288,40	1 польскі злоты	1100,18
1 латвійскі лат	6 056,35	1 расійскі рубель	98,14
1 літоўскі літ	1 244,59	1 украінская грыўня	378,68

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрбанк РФ

USD	30,7709
10 UAH	38,6569
1000 BYR	10,2059
EUR	43,1654

Агенцтва Уладзімірa Грaўцова

Ліга чэмпіёнаў

Данецкі «Шахцёр» пакараў «Арсенал», а «Спартак» разгромлены ў Лондане

У 1/8 фіналу выйшлі «Рэал», «Баварыя» і «Чэлсі»

У сераду адбыліся восем матчаў футбольнай лігі чэмпіёнаў у групах «E», «F», «G» і «H».

Адным з самых інтрыгуючых паядынкаў стаў матч у **групе «G»** паміж італьянскім «Міланам» і іспанскім «Рэалам». Італьянцы выйгравалі 2:1 да апошняй хвіліны матча, але «Рэал» ёсць «Рэал». На апошніх секундах (на чацвёртай дабаўленай хвіліне) «вяршковыя» ўмудрыліся зрэзаць лік! І з 10 ачкамі аформілі выхад у 1/8 фіналу. Адметна, што форвард «Мілана» Філіпа Індзагі, які забіў абодва галы ў вароты «Рэала», абнавіў спіс выніковасці, абагнаўшы па гэтым паказчыку Рауля. За што быў удастоены абдымкаў трэнера «Рэала» Жазэ Маўрынью.

«Я ведаю, што Маўрынью мяне паважае. Летась, калі ён працаваў у «Інтэры», здзівіў тым, што дачакаўся мяне ў раздзявальні, каб папрасіць футболку. Такі ўчынак сведчыць пра многае. Я быў вельмі рады, калі ўчора ён мяне абняў», — цытуе Філіпа Індзагі афіцыйны сайт УЕФА.

У другім матчы групы французскі «Асер» вырваў перамогу ў галандскага «Аякса» — 2:1 і набраў першыя тры ачкі ў групе.

У групе «F» «Чэлсі» зноў быў мацней за маскоўскі «Спартак», дакладней, проста яго разграміў — 4:1. Расійскі клуб зноў хапіла толькі на адзін тайм — пасля першай паловы гульні лік быў нічыйны — 0:0. «Чэлсі», на рахунку якога 12 ачкоў, аформіў выхад у 1/8 фіналу. У другім матчы групы французскі «Марсэль» разграміў у гасцях славацкую «Жыліну» з зусім непрыстойным лікам — 7:0.

Яшчэ адзін прадстаўнік постсавецкай прасторы, украінскі «Шахцёр», рэабілітаваўся пасля першага паражэння ад «Арсенала». І на гэты раз пакараў англічан — 2:1, пра што і заявіў Арсен Венгер: «Было 20 хвілін, калі мы дзейнічалі расхлябана. За гэта і паплаціліся. Мы не змаглі аформіць выхад з групы». Маючы роўную колькасць ачкоў з «Арсеналам» (па 9), украінскі клуб мае нядрэнныя шанцы на выхад з групы. У другім матчы **групы «H»** сербскі «Партызан» саступіў партугальскаму клубу «Брага» — 0:1.

У групе «E» «Баварыя» разграміла румынскі «Клуж» і з 12 ачкамі аформіла выхад у 1/8. У другім матчы «Рома» рэабілітавалася за сенсацыйнае хатняе паражэнне двухтыднёвай даўнасці і перамагла швейцарскі «Базэль» — 3:2.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Абзац

◢ 45 л ядахімікатаў выявілі гомельскія памежнікі і мытнікі ў рэйсавым аўтобусе «Кіеў—Вільнюс». Хімічны прэпарат для апрацоўкі сельгаскультур быў знойдзены ў аўтобусе ў пункце пропуску «Новая Гута». Ядахімікаты былі схаваныя ў спальным адсеку кіроўцы за дэкаратыўнай абшыўкай. Кіроўца патлумачыў, што груз, хутчэй за ўсё, застаўся ад папярэдняга рэйса. Кошт канфіскаванага — каля Br57,5 млн, аўтобус ацэнены ў Br270 млн. Вядзецца праверка.

◢ **Мінскія праваахоўнікі — супрацоўнікі пракуратуры і міліцыі — раскрылі забойства выкладчыка гімназіі з Магілёва. Яго цела было знойдзена 15 кастрычніка на агульным балконе жылога дома ў Мінску. Забойцам аказаўся 22-гадовы непрацуючы жыхар в. Станькава Дзяржынскага раёна. Напярэдадні ён быў вызвалены з месцаў пазбаўлення волі, дзе «сядзеў» за згон аўтамабіля. У электрычцы ён пазнаёміўся з выкладчыкам. Далей было спіртное, спрэчка і забойства.**

◢ Начальнік аддзялення прызыву Барысаўскага райваенкамата асуджаны за хабар на 4 гады калоніі. Ён быў затрыманы ў канцы мінулага года пры атрыманні хабару ў памеры $450 за вырашэнне пытання аб прадастаўленні незаконнай адтэрміноўкі ад прызыву. Акрамя таго, было ўстаноўлена, што былы падпалкоўнік неаднаразова прымаў ад прызыўнікоў грошы за падрыхтоўку дакументаў, што даюць падставу не служыць у войску. Следствам было ўстаноўлена 5 такіх фактаў. Ваенны трыбунал прысудзіў яму пакаранне — 4 гады ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму, канфіскацыю маёмасці і пазбаўленне звання.

Поўны абзац

◢ **У Екацярынбургу зварылі 50-кілаграмовы пельмень. Ідэя належыць студэнтам і выкладчыкам Уральскага горнага інстытута. Народную страву выбралі ў якасці ўніверсальнага пачастунку ў дзень народнага адзінства па той прычыне, што яна сустракаецца ў вельмі многіх нацыянальных кухнях. Для стравы ўзялі 20 кг цеста і 30 кг мяса, свініну і ялавічыну. Пасля таго, як пельмень зляпілі, яго падчапілі кранам і апусцілі ў 800-літровы кацёл. Праз паўтары гадзіны — зноў жа кранам — дасталі і адразу ж узважылі. Вага вырабу аказалася 56 кг 400 грамаў.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Факт

ПЕРАД СВАЁЙ СМЕРЦЮ РАСПАЗНАЎ...

Нездарма кажуць, што свет цесны. І бывае так, што знаёмства каштуе жыцця. Вадзіцеля забіў ягоны знаёмы толькі за тое, што першы яго распазнаў. Злодзей пабаяўся, што вадзіцель паведаміць у міліцыю пра напад на яго.

Як расказаў «Звяздзе» **Андрэй ГРЫГОР'ЕЎ, следчы па важнейшых справах следчага аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці**, перад судом будзе адказваць за сваю крымінальную дзейнасць 39-гадовы ўраджэнец Полацка. Падчас следства было ўстаноўлена, што ў Карэліі (у пасёлку Матросы) Аляксандр Пятроў (прозвішча зменена — **А.П.**) дамовіўся з адным грамадзянінам пра тое, каб абрабаваць выпадковага кіроўцу, які будзе праязджаць па трасе Санкт-Пецярбург—Мурманск.

У Пятрова для чорнай справы была прыгатаваная самаробная зброя — два «мадыфікаваныя» сігнальныя пісталеты.

Зладзеі «галасавалі» на дарозе, спынілі «Пежо». Пятроў падышоў да дзвярэй з боку кіроўцы і пачаў пагражаць зброяй. Патрабаваў, каб той аддаў грошы. Сілай спрабавалі адабраць і мабільны тэлефон.

Раптам ахвяра рабаўніцтва распазнала злодзея з пісталетам у руках. Успомніў, што аднойчы быў у аўтамайстэрні, дзе працаваў рабаўнік. Злодзей пабаяўся пакідаць жыццё кіроўцы і выстраліў яму ў галаву і сэрца. Чалавек памёр. Потым забойца пакінуў месца трагедыі на аўтамабілі сваёй жа ахвяры.

Затрымалі яго ў Беларусі. За свае дзеянні ён можа быць пазбаўлены волі тэрмінам да 25 гадоў. Не выключанае смяротнае пакаранне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАДНАЧАЛЕНЫЯ БУДАВАЛІ ДЫРЭКТАРУ ДОМ

У Бабруйску расследуецца крымінальная справа аб злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі.

Як паведаміў прэс-цэнтр Магілёўскага УУС, справа распачата ў дачыненні да 48-гадовага бабруйчаніна, які займаў пасаду дырэктара адной з дарожна-будаўнічых арганізацый горада. Міліцыя выявіла, што з лютага па чэрвень 2008 года гэты чалавек неаднаразова, наўмысна і з карыслівай зацікаўленасці даваў указанні падначаленым, каб яны ў працоўны час будавалі прыватны дом на яго зямельным участку ў Бабруйску.

Алена КАЗЛОВА.

ЛІКВІДАВАЛІ ПЕРАВАЛАЧНУЮ БАЗУ

У гаспадарчых пабудовах населеных пунктаў, якія знаходзяцца непадалёку ад мяжы — Арэхава, Камароўка і Тамашоўка — памежнікі сумесна з мытнікамі і спецузводам ДАІ «Буг» ліквідавалі 4 месцы складзіравання кантрабанды.

Удалося канфіскаваць 30 сумак з трыкатажам і 27 каробак з касметыкай. Сума кантрабаднага тавару вылілася ў 320 млн рублёў.

Пры затрыманні было аказана супраціўленне, і цяпер затрыманыя могуць панесці не толькі адміністрацыйнае пакаранне, але і крымінальнае. У іх знайшлі паляўнічую стрэльбу і пнеўматычны пісталет.

НАШЫ ЖУРАВІНЫ — САМЫЯ-САМЫЯ...

Пінскія памежнікі затрымалі 19 грамадзян Украіны (8 з іх — непаўналетнія), якія перайшлі беларуска-ўкраінскую мяжу, каб забрацьжуравіны, якія назбіралі на нашым балоце раней.

Парушальнікаў мяжы перадаюць групамі ўкраінскаму боку.

ЗАПАЛКУ ПАД ВЯНКІ

У Пінскім гарадскім парку імя Чырванасцяжнай Дняпроўскай флатыліі знаходзіцца помнік «Мемарыяльны комплекс вызвалярам». Да гэтага помніка былі ўскладзены вянкі, якія невядомы вандал падпаліў. Агонь пашкодзіў 18 вянкоў.

Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПЕРАПРАЦОЎКА ПАШУКАЕ СЫРАВІНУ, А ПІВАВАРЫ — ДОБРЫ МЕНЕДЖМЕНТ

За апошні час на прадпрыемствах харчовай галіны Беларусі была праведзена буйная мадэрнізацыя — у параўнанні з 2005 годам тэмп росту інвестыцый у асноўны капітал павінен выйсці на адзнаку ў 200 працэнтаў. Разам з тым, як паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Іван Данчанка, у бліжэйшы час неабходна рэалізаваць яшчэ некалькі па-сапраўднаму цікавых праектаў.

ФАСОЛЯ, БУЯКІ, ГАРОШАК

Дзякуючы буйным інвестыцыям прадпрыемствы канцэрна здолелі павялічыць выпуск кансервавай прадукцыі адразу ў чатыры разы. Айчынныя кансервы, сокі і дзіцячае харчаванне склалі сапраўдную канкурэнцыю імпарту, прычым цікава: у перспектыве ёсць намер займацца прадукцыяй, увогуле нехарактэрнай для нашай краіны. Гаворка ідзе пра фасоўку гарбаты, сушанай паўднёвай садавіны, вытворчасць гранатавага соку. На гэты конт адпаведныя перамовы сёння ідуць з патэнцыяльнымі інвестарамі з Азербайджана.

Аднак тут ёсць і сур'ёзная праблема. Пакуль магутнасці прадпрыемстваў кансервавай галіны загружаныя недзе на 70-75 працэнтаў. Па вельмі банальнай прычыне — не хапае сыравіны, напрыклад, парэчак, чарніц, буякоў, зялёнага гарошку, брусельскай капусты, брокалі, спаржавай фасолі. Прычым кампенсаваць дэфіцыт, на думку старшыні канцэрна, магчыма толькі шляхам стварэння прадпрыемствамі ўласных сыравінных зон і падтрымкі гаспадарак і фермераў, якія будуць працаваць «пад заказ». Разам з тым, заўважыў Іван Данчанка, падчас стварэння тых жа сыравінных зон маюць патрэбу ў дапамозе і самі перапрацоўчыя прадпрыемствы — у тым ліку ў дапамозе на ўзроўні абласцей.

ЧАТЫРЫ — МАЛА

Пра тое, што айчынныя прадпрыемствы не толькі забяспечваюць нашу краіну цукрам, але і паспяхова працуюць на экспарт, вядома даўно. Аднак у канцэрне перакананыя: экспартныя магчымасці галіны выкарыстоўваюцца далёка не цалкам. Таму на працягу наступных пяці гадоў будуць павялічвацца магутнасці чатырох цяперашніх заводаў. А плюс да таго, павінна з'явіцца цалкам новае, пятае прадпрыемства. У якасці патэнцыяльных пляцовак для яго разглядаюцца Магілёўская і Гродзенская вобласці.

Сёння вядзецца актыўны пошук інвестара, і ў тым ліку гэты праект будзе прэзентаваны на Беларускім інвестыцыйным форуме ў Франкфурце. Пры гэтым Іван Данчанка не выключыў: новы цукровы завод можа мець 100-працэнтны замежны капітал. Аднак у любым выпадку Беларусь застанецца ў выйгрышы, бо гаворка — пра дадатковыя працоўныя месцы, падатковыя паступленні ў бюджэт і павелічэнне аб'ёмаў сельгасвытворчасці. Так, чакаецца, што да 2015 года ў нас можа вырошчвацца ўжо да 5,5 млн тон тых жа цукровых буракоў.

ДРОЖДЖЫ З РАЗЛІКАМ НА ЭКСПАРТ

Ужо ў хуткім часе плануецца падпісанне іншага інвестыцыйнага дагавора коштам 25 млн еўра — на будаўніцтва новага дражджавога завода ў Слуцку. Прадугледжваецца, што 70 працэнтаў укладанняў тут зробіць германская кампанія «Uniferm».

— Трапіць на прыём да спецыялістаў гарадскога цэнтра памежных станаў даволі проста — варта пазваніць у рэгістратуру цэнтра па нумары 245 61 74 і запісацца на прыём.

☎ — Віцебск, Алена. Сыну 15 гадоў. І ў бацькі, і ў мяне добрыя адносіны з ім. Але ён не падобны на нас. Усё робіць па-свойму. У чым і як мы павінны кантраляваць дарослага сына, каб не сапсаваць сітуацыі?

— Прыемна чуць, што ў вас добрыя адносіны з сынам. Верагодна, ваша дзіця валодае незалежным мысленнем і дастатковай упэўненасцю ў сабе. Акрамя таго, калі дзіця імкнецца да самастойных рашэнняў і дзеянняў, нават калі яны адрозніваюцца ад бацькоўскіх, — гэта яшчэ не азначае, што яно робіць дрэнна. У аснове добрых адносін з дзецьмі павінны быць, безумоўная любоў і павага. Дзецям проста неабходна адчуваць наша шчырае жаданне зразумець іх, прыняць такімі, якія яны ёсць, нават калі яны не вельмі падобныя на нас. Такое стаўленне дапаможа сфарміраваць давер да бацькоў, а значыць, умацаваць узаемаадносіны.

Ваша дзіця знаходзіцца ў такім узросце, калі ва ўсім яго арганізме, у прыватнасці ў псіхіцы, адбываюцца магутныя змены, звязаныя з працэсамі яго фізічнага і сацыяльнага сталення. Бацькі павінны гэта ведаць і ўлічваць для таго, каб правільна будаваць адносіны з дзецьмі. Ранейшыя дырэктыўныя метады ўздзеяння могуць не спрацоўваць. У падлеткавым узросце ў дзіцяці з'яўляецца імкненне як бы аддзяліцца ад бацькоў, адчуць сябе больш самастойным і незалежным. Падлетак аддае перавагу равеснікам, меркаванне якіх для яго становіцца больш значным, чым бацькоўскае. Паводзіны могуць станавіцца больш дзёрзкімі і дрэнна паддавацца ўплыву дарослых. Задача бацькоў у такой сітуацыі — захоўваць роўныя адносіны да дзіцяці, пазбягаць зняваг у яго адрас і спроб зламіць, падпарадкаваць сваёй волі любым спосабам. Такім чынам будзе расцей устанавіць добры кантакт і ўзаемаразуменне.

— Хто павінен пагаварыць з сынам пра сэкс? З чаго лепей пачаць?

— Мяркую, размову на тэму сэксуальнага выхавання сына больш карэктна было б пачаць бацьку ці іншаму дарасламу мужчыну — свайму, сябру сям'і, якому падлетак давярае. Размову пажадана праводзіць у спакойнай і паважлівай форме, як дарослы з дарослым. Магу меркаваць, што да 15-ці гадоў падлетак ужо мае нейкае ўяўленне пра сэксуальныя адносіны, улічваючы шырокія магчымасці сродкаў масавай інфармацыі, інтэрнэту, а таксама вопыт стасункаў з равеснікамі. Таму задача бацькі крыху аблягчаецца.

— Якім чынам трэба правільна адмаўляць дарослым дзецям у тых ці іншых рэчах?

— У жыцці нам часта даводзіцца гаварыць людзям «не». Калі ты адмаўляеш у чым-небудзь каму-небудзь, у тым ліку і дзіцяці, гэтыя словы неабходна выказаць у спакойнай, паважлівай манеры і абавязкова аргументаваць свой пункт гледжання.

☎ — Бабруйск, Алена. Больш за дваццаць гадоў жыву з алкаголікам. Расказаць у двух словах пра тое, што я адчуваю ў дачыненні да гэтага чалавека, немагчыма. Нянавісць — самае мяккае азначэнне. Я ведаю, што блізкіх хворых на алкагалізм называюць сузалежнымі. Але што гэта азначае? Як захаваць здароўе, калі даводзіцца суіснаваць на агульнай жылплошчы?

— Залежнасць аднаго з членаў сям'і непазбежна парушае ўнутрысямейныя ўзаемаадносіны. У большасці сем'яў, у якіх жывуць людзі з залежнасцю, выяўляюцца ўскладненні, якія ў апошнія пятнаццаць гадоў пачалі абазначацца тэрмінам «сузалежнасць». Сузалежнасць з'яўляецца пакутным станам для ўсіх членаў сям'і, якія прымаюць правілы і формы ўзаемаадносін, якія падтрымліваюць сям'ю ў дысфункцыянальным стане.

Сузалежнасць — па-першае, фактар рызыкі рэцыдыву залежнасці ў хворага; па-другое, — фактар рызыкі ўзнікнення розных парушэнняў у дзяцей, у першую чаргу той жа залежнасці; па-трэцяе, — глеба для развіцця псіхасаматычных захворванняў і дэпрэсіі... Калі гавораць пра нізкую эфектыўнасць лячэння залежнасці, пра рэцыдыў, часта спасылаюцца на тое, што «хворы вярнуўся ў ранейшае асяроддзе». Сапраўды, асяроддзе, асабліва сямейнае, можа спрыяць рэцыдыву...

У якасці рабочага азначэння прынятае наступнае: «Сузалежны чалавек — гэта той, каго поўнасцю паглынуў працэс кіравання паводзінамі іншага чалавека і які абсалютна не заклапочаны задавальненнем сваіх уласных жыццёва важных патрэб». Сузалежныя жонкі, маці, сёстры кантралююць хворых і вераць, што ў стане кантраляваць усё. Чым больш хаатычная сітуацыя дома, тым больш намаганняў яны прыкладаюць для яе кантролю. Нярэдка жонкі хворых на алкагалізм, каб кантраляваць паводзіны мужа, звальняюцца з работы і такім чынам самі трапляюць пад кантроль падзей або хворых на залежнасць. Сузалежны лічыць, што яго праблемы — гэта вынік разбуральных паводзін іншага, а таму бачыць мэту работы псіхатэрапеўта ў змяненні хворага. Часцей за ўсё такі чалавек не падазрае, што з'яўляецца сузалежным і сам мае патрэбу ў псіхатэрапеўтычнай дапамозе. Прадастаўленне яму псіхалагічнай інфармацыі з'яўляецца асноўнай задачай спецыяліста на пачатковым этапе работы.

Спадзяюся, такое паняцце пра сузалежнага чалавека дапаможа вам перагледзець сваё стаўленне да праблемы, вырашыць, як жыць далей і што рабіць, калі побач залежны чалавек.

(Працяг будзе.)

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛІСТАПАД

5 лістапада. Лепш адкласці стрыжку на больш спрыяльны для гэтага перыяд.

6 лістапада. Стрыжка валасоў можа прывесці да сварак і судовых цяжбаў.

7 лістапада. Стрыжка валасоў прывядзе да матэрыяльных страт і пагаршэння здароўя.

8 лістапада. У выніку стрыжкі ў гэты дзень магчыма ўзнікненне пачуцця дыскамфорту і тугі, звязаных са страхам страты блізкіх. Магчымыя абвастрэнні захворванняў горла і ротавай поласці.

9 лістапада. Стрыжка прывядзе да паляпшэння матэрыяльнага становішча і агульнага дабрабыту.

10 лістапада. Паказанні для гэтага дня такія ж, як і напярэдадні.

11 лістапада. У гэты дзень лепш пазбягаць наведвання цырульні. Можна падхапіць прастуду.

12 лістапада. Дзень, калі стрыжка валасоў можа прывесці да канфліктаў з блізкімі ці кіраўніцтвам. Магчымыя розныя абвастрэнні захворванняў.

13 лістапада. Ідэальны дзень для стрыжкі валасоў. Абяцае добрае самаадчуванне і нябеднае існаванне да старасці.

14 лістапада. Хваробы і разнастайныя праблемы чакаюць чалавека, які пастрыгся ў гэты дзень.

15 лістапада. Лепш устрымацца ад наведвання цырульні. Гэта дзень, які «спальвае», паводле тыбецкіх традыцый, таму стрыжка можа пагражаць пагаршэннем здароўя.

16 лістапада. Стрыжка ў гэты дзень развівае вастрыню органаў пачуццяў, паляпшае праніклівасць розуму.

17 лістапада. Стрыжку лепш перанесці на больш спрыяльны перыяд, бо ў гэты дзень можна прыцягнуць няшчасці, павялічваецца верагоднасць траўматызму.

18 лістапада. Добры дзень для стрыжкі. У гэты дзень вы не толькі набудзеце прывабны знешні выгляд, але і прыцягнеце ў сваё жыццё ўдачу і шчасце.

19 лістапада. Паляпшэнне ва ўсіх сферах жыцця (ад становішча ў грамадстве да матэрыяльнага дабрабыту) чакае пасля сённяшняга наведвання цырульні.

20 лістапада. Неспрыяльны дзень для наведвання цырульніка. Стрыжка ў гэты дзень тоіць у сабе небяспечныя наступствы ва ўсіх галінах жыцця (ад парушэння стану ўсяго арганізма да псіхічных працэсаў).

21 лістапада. Робячы стрыжку ў гэты дзень, вы сутыкаецеся з верагоднасцю асабістых памылак і выпадковасцяў, якія ідуць следам. Акрамя таго, стане складана трымаць пад кантролем свае страсці і негатыўныя звычкі.

22 лістапада. Стрыжка стварае розныя перашкоды ў справах і вядзе да пагаршэння здароўя (ад павелічэння верагоднасці траўматызму да парушэнняў псіхічнай дзейнасці). Згодна з усходнімі традыцыямі, самыя шкодныя духі прыцягваюцца падчас стрыжкі ў гэты дзень.

23 лістапада. Стрыжка ў гэты дзень павялічвае верагоднасць накіраванага супраць вас крадзяжу або рабаўніцтва, што можа пацягнуць за сабой не толькі страту маёмасці, але і пагаршэнне здароўя.

24 лістапада. У гэты дзень лепш адкласці справы і завітаць да цырульніка, бо стрыжка ў гэты дзень падаўжае жыццё.

25 лістапада. Стрыжка ў гэты дзень дапамагае змяніць стаўленне да жыцця. Нават самы заўзяты аптыміст пачне прыглядацца да жыццёвага негатыву, аж да ўзнікнення ўстойлівага пачуцця агіды да навакольных.

26 лістапада. Сённяшняя стрыжка абяцае не толькі знешнюю, але і ўнутраную прыгажосць і, як вынік, — дабрабыт і добрае становішча.

27 лістапада. З аднаго боку, стрыжка ў гэты дзень дае магчымасць набыцця ўласнасці, а з другога — можа прывесці да павелічэння вагі, што адаб'ецца на стане арганізма ў цэлым.

28 лістапада. Стрыжка ў гэты дзень дае здаровы колер твару і паляпшае дабрабыт.

29 лістапада. Для стрыжкі дзень вельмі неспрыяльны. Пагражае пагаршэннем здароўя, асабліва калі ўжо маюцца хранічныя ці схаваныя захворванні.

30 лістапада. У гэты дзень магчыма павелічэнне ўнутрывочнага ціску ці абвастрэнне захворванняў вачэй. Высокая верагоднасць з'яўлення ячменю ці запаленняў.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

БЕЛАРУСКІХ АЛІМПІЙЦАЎ АДПРАЎЛЯЮЦЬ ЛЯЧЫЦЦА Ў ЗВЫЧАЙНУЮ ПАЛІКЛІНІКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як вядома, плануецца рэвалюцыйная рэканструкцыя стадыёна «Дынама». Будынак Рэспубліканскага цэнтра спартыўнай медыцыны прымыкае да гэтай арэны, і па новым плане замест спартыўнага медцэнтра пабудуюць гатэль. З аднаго боку, гэта немалыя замежныя інвестыцыі, з другога — сур'ёзныя складанасці. Спартыўных медыкаў збіраюцца перасяліць у будынак былой паліклінікі сталічнага мікрараёна Лошыца. Памяшканне знаходзіцца на першым паверсе жылога дома па вуліцы Лучыны, 6.

— Размовы пра перасяленне пачаліся ў пачатку года, калі прыйшло прадпісанне, што мы павінны адсюль з'ехаць, — прыйшоў у рэдакцыю «Звязды» адзін са спартыўных урачоў, супрацоўнік цэнтра спартыўнай медыцыны. *— Мы служба рэспубліканскага значэння, а не звычайная паліклініка. Нас немагчыма ўзяць і ў адзін дзень вось так перасяліць.*

▲ Паспешлівы пераезд Рэспубліканскага цэнтра спартыўнай медыцыны можа прывесці да правалу на топ-спаборніцтвах.
▶ У спісе спартсменаў, якія заступаюцца за цэнтр, больш за 50 чалавек. У асноўным гэта вядомыя ў спорце прозвішчы.

Аднак ля будынка ўжо здымаецца тратуарная плітка, робіцца аналіз глебы, вядуцца іншыя падрыхтоўчыя работы...

Не паверыўшы сваім вушам (усё ж Беларусь — спартыўная дзяржава, а медыцына — гэта аснова добрых вынікаў), я выправіўся ў будынак па вуліцы Свярдлова, 9, дзе пакуль яшчэ месціцца Рэспубліканскі цэнтр спартыўнай медыцыны.

Дырэктар цэнтра Яўген Ласіцкі адмовіўся ад інтэрв'ю — пытанне балючае, звяртайцеся ў Міністэрства спорту і турызму. На анамімную размову пагадзіўся ўрач, блізкі да кіраўніцтва (сваё імя і прозвішча ён папрасіў не называць, усе звесткі ёсць у рэдакцыі):

— Пра тое, што перад чэмпіянатам свету па хакеі ў Мінску збудуюць гатэль на нашых плошчах, нам паведамілі раптоўна. У жніўні пасяджэнне Мінгарвыканкама прыняло рашэнне высяляць цэнтр. Па сутнасці гэта ўдар па нацыянальнай спартыўнай медыцыне.

— Да чаго такое рашэнне можа прывесці?

*— Гэта азначае, што план у 25 алімпійскіх медалёў мы дакладна не выканаем. Што ўжо казаць пра чэмпіянаты свету і Еўропы. Чыноўнікі, якія задумалі будаўніцтва гатэля, не могуць зразумець, што без якаснай медыцыны медалёў не будзе. Месца для залы лячэбнай фізкультуры, стаматалогіі і іншых службаў — няма. Але не ўсе чыноўнікі разумеюць праблему. Медыкі з цэнтра паказалі журналісту «Звязды» дакумент — «Дакладную запіску», якую Мінгарвыканкам атрымаў у канцы жніўня гэтага года. У дакументе прапаноўваюцца будынкі, куды магчыма перасяліць цэнтр спартыўнай медыцыны — усяго 16 аб'ектаў. Большасць з іх — былыя дашкольныя ўстановы, якія разглядаць для галоўнага ў краіне цэнтра спартыўнай медыцыны папросту несур'ёзна. Няўжо ў Міністэрстве спорту таксама не разумеюць праблемы і свядома рызыкуюць вынікамі лонданскай Алімпіяды?

— Павінен вам сказаць, што гэтыя пытанні вырашае не Міністэрства спорту, кантракты з падрадчыкамі заключаем таксама не мы, — тлумачыць журналісту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства Віталь СЯМАШКА. — *Апроч цэнтра спартыўнай медыцыны пад забудову трапілі яшчэ дзве нашы арганізацыі — «Белспортзабеспячэнне» і цэнтр адзінаборстваў. На іх месцы плануюць збудаваць гатэль «Кемпінскі». Цэнтр спартыўнай медыцыны не хоча перасяляцца ў аналагічны будынак, яму патрэбна новая забудова, больш сучасная, дзе можна паставіць найноўшае абсталяванне і гэтак далей. Натуральна, што такія новыя комплексы будуюцца не за адзін дзень. Зараз нам варта думаць на перспектыву...*

> *— Гэта азначае, што план у 25 алімпійскіх медалёў мы дакладна не выканаем. Што ўжо казаць пра чэмпіянаты свету і Еўропы. Чыноўнікі, якія задумалі будаўніцтва гатэлю, не могуць зразумець, што без якаснай медыцыны медалёў не будзе.*

Урачы паказалі журналісту «Звязды» сучасны рэнтгеналагічны апарат, здымкі з якога можна адразу глядзець па камп'ютарах у розных кабінетах. У будынку былой паліклінікі па вуліцы Лучыны ўсталяваць такі апарат нельга, таму што памяшканне месціцца ў жылым доме.

Яшчэ адна суперпрылада — апарат ударнахвалевай тэрапіі, які ўзнаўляе структуру касцявой тканкі. І яго нельга падключыць у «новым» будынку. Амбулаторыя па вуліцы Лучыны нават у параўнанні з сённяшнім будынкам цэнтра на 30% меншая па плошчы. Кабінетаў — прыкладна на 30 меней, некаторых урачоў не будзе куды пасадзіць.

Тым часам вядомыя беларускія спартсмены, якія лічаць, што высяленне цэнтра спартыўнай медыцыны нясе пагрозу, падрыхтавалі «Адкрыты ліст спартсменаў нацыянальных і алімпійскіх камандаў». *«Не пазбаўляйце нас спецыялізаванай дапамогі адзінай у Мінску ўстановы, якая даўно і стабільна працуе на ўвесь спорт Беларусі»,* — значыцца ў лісце. За некалькі дзён яго падпісала больш за 50 спартсменаў, сярод якіх медалісты Алімпіяд і чэмпіянатаў свету Вадзім Дзевятоўскі (кіданне молата), Наталля Гелах і Юлія Бічык (грэбля), Ігар Басінскі (кулявая стральба), баскетбалісткі Таццяна Троіна, Марына Крэс і многія іншыя.

«Звязда» будзе сачыць за развіццём спартыўнага канфлікту.

Яўген ВАЛОШЫН.

Здарэнні

ВЫРАТАВАЛІ ЗАЦІСНУТАГА І «ПАЛАЮЧАГА» ВАДЗІЦЕЛЯЎ

Учора раніцай па нумары 101 з мабільніка патэлефанаваў мужчына, які сказаў, што... заціснуты ў кабіне аўтамабіля МАЗ-500.

Паводле слоў кіроўцы, каб пазбегнуць сутыкнення з сабакам, шт раптоўна выбег перад МАЗам, ён узяў улева і сутыкнуўся з дрэвам. З дапамогай бензарэза і гідраўлікі вадзіцеля вызвалілі. Ён быў шпіталізаваны ў Бабруйскую цэнтральную бальніцу з выцятым правым каленам.

А ў сталіцы напярэдадні на вуліцы Я. Коласа падчас руху загарэўся старэнькі «Фальксваген Пасат» 1987 года выпуску. Кіроўца нават не заўважыў, што ў яго машыны з-пад днішча вырываюцца языкі полымя. На шчасце, насустрач яму якраз ехалі выратавальнікі, якія вярталіся з вучэнняў. Прасігналіўшы вадзіцелю легкавіка, яны з дапамогай двух вогнетушыцеляў у лічаныя хвіліны ліквідавалі пажар.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЗЯЎЧЫНА ПАДМАНУЛА ДАЛЬНАБОЙШЧЫКА

Дзве маладыя жанчыны адпачывалі ў кампаніі дальнабойшчыкаў у прыгарадзе Віцебска. Адна з іх потым скрала ў вадзіцеля дальніх рэйсаў валюту.

Як расказала «Звяздзе» **памочнік пракурора Віцебскага раёна Наталля СЕЎРУКОВА**, жанчына скрала ў кіроўцы 250 еўра, калі той спаў. На судзе растлумачыла, што хацела патраціць гэтыя грошы, каб яшчэ выпіць. Лікёру, віскі і гарэлкі, якую піла разам з вадзіцелямі, паказалася мала? Асуджаная аштрафаваная на 2,1 мільёна рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

16.11.2010 г. в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж».

Повестка дня:

1. О приобретении акций ОАО «Сантехэлектромонтаж» на баланс Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А.

Начало регистрации участников собрания — 14.30. УНП 400052115

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 23 ноября 2010 в 15.00 состоится ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН (повторный) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Весоприбор» (продавец), в составе следующих лотов (предмет торгов):

ЛОТ № 2 – Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расп. по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе: кап. строение с инв. № 710/С-58317 (здание заготовительно-штамповочного цеха) пл. 1148,9 кв.м, с сооруж.: забор (ж./бет.) пл. 12 м², забор (кирп.) пл. 135 м², забор (метал. сетка) пл. 92 м², ворота (метал.) пл. 11 м², калитка (метал.) пл. 2 м², мощение (асф./бет.) пл. 326,75 м²; пути подкрановые; кап. строение с инв. № 710/С-51530 (здание склада ГСМ) общей площадью 118,1 кв.м; кап. строение с инв. № 710/С-54307 (здание склада) общ. пл. 81,6 кв.м; кап. строение с инв. № 710/С-54308 (здание цеха голтовки) общ. пл. 111,7 кв.м; кап. строение с инв. № 710/С-54306 (здание трансформаторной подстанции) общ. пл. 30,1 кв.м; в том числе: оборудование КТП 10/04-1 х 400 (инв. № 62), кран-балка г/п 3 т (инв. № 184а, 199, 191а), кран-балка г/п 5 т (инв. № 485), таль эл. г/п 5 т (инв. № 1222, 1223), кран-укосина г/п 0,5 т (инв. № 1010).		
ЛОТ № 4 – Кап. строение с инв. № 710/С-41497 (здание склада материалов и оборуд.) пл. 1 959,2 кв.м, расп. по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, с сооруж.: подкран. эстакада пл. 656 м², забор (кирп.) пл. 187 м², мощение (асф./бет.) пл. 654 м²		
Общие сведения	**Лот № 2**	**Лот № 4**
Организатор торгов	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»** (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), Бобруйское управление	
Место проведения торгов и подачи документов	**г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30**	
Начальная цена продажи, рублей без учета НДС	575 068 817 задаток 10 % – 57 506 882 руб.	414 272 459 задаток 10 % – 41 427 246 руб.
Номер расчетного счета для перечисления задатка	**Получатель платежа ОАО «Весоприбор» – р/с 3012000002968 в филиале 703 ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700090810**	
Площадь земельного участка	**0,3418 га, в т.ч.:** 0,3365 га – кадастр. № 741000000009001751 и 0,0053 га – кадастр. № 741000000009001746	**0,2399 га** – кадастровый № 741000000009001753
	Правовой режим – постоянное пользование	
Условия продажи	Помещение пл. 65,29 кв.м, расп. в кап. строении инв. **№ 710/С-58317,** сдано по договору аренды до момента ликвидации ОАО «Весоприбор», но не позднее 09.09.2014 г.	Аукцион без условий
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона	
Сроки и условия оплаты	Определяются по согласованию победителя с продавцом при заключении договора купли-продажи	
Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка	**включительно по 22 ноября 2010 г. до 16.00**	
***Более подробная инф. об условиях участия в аукционе, характеристиках предмета торгов, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Рэспубліка» № 37 (4949) от 27.02.2010 г.**		

Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 12 ноября 2010 г. в 15.00 СОСТОЯТСЯ ОТКРЫТЫЕ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ по продаже незавершенного строительством комплекса зданий и сооружений, расположенного в г. Бобруйске по ул. Энергетиков, 5 (предмет торгов) в составе:

ЛОТ № 1: незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3795 (административно-бытовой корпус) пл.1941,8 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3797 (вспомогательный корпус) пл. 2776,3 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3796 (производственный корпус) пл. 5386 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв. № 710/С-3798 (заправка) пл. 87 кв.м; незавершенное кап. строение (очистное сооружение литер 5Б) пл. 14,67 кв.м; незавершенное кап. строение (очистное сооружение литер 4Б) пл. 14,78 кв.м; ограждение ж./бет. пл. 2244 кв.м. с воротами металлическими площадью 12,6 кв.м; незавершенные строительством сооружения: покрытие бетонное пл. 2550 кв.м, резервуары установки пожаротушения пл. 32,5 кв.м, грязеуловители, внутриплощадочные тепловые сети.	
Продавец (собственник)	**Открытое акционерное общество «Белшина», УНП 700016217**
Организатор торгов	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509** (р/с 3012035310012 в ф-ле ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331)
Место проведения торгов и подачи документов	**г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»**
Начальная цена продажи	4 761 032 330 рублей без учета НДС; размер задатка 5 %, что составляет 238 051 620 рублей
Номер расчетного счета для перечисления задатка	**Получатель платежа ОАО «Белшина» – р/с 3012000003446 в ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО 147621337000**
Площадь земельного участка	5,9884 га, правовой режим – право постоянного пользования
Условия продажи	Аукцион без условий
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Срок и условия оплаты	Определяются по согласованию Победителя торгов с Продавцом при заключении договора купли-продажи
Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка	**включительно по 11 ноября 2010 г. до 16.00**
***Более подробная инф. об условиях участия в торгах, характеристиках предмета торгов, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» № 185 (26793) от 22.09.2010 г.**	

Получить дополнительную инф. о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 8 декабря 2010 г. открытого аукциона по продаже обращенного в доход государства недвижимого имущества

	ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА № 1	ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА № 2
Наименование и характеристики продаваемого имущества	Изолированное помещение (трехкомнатная квартира), расположенное на пятнадцатом этаже шестнадцатиэтажного дома, общая площадь – 82,6 кв.м, жилая площадь – 45,9 кв.м. Инвентарный номер – 500/D-7060878.	1/20 доля помещения транспортного назначения (машиноместо) № 10 Н, расположенного в подвале. Инвентарный номер – 500/D-7110155
Местонахождение имущества	г. Минск, ул. Шпилевского, д. 57, кв. 118	г. Минск, ул. Шпилевского, д. 57, пом. 10 Н
Сведения о собственнике	Тарасенко Э.Л.	Тарасенко Э.Л.
Начальная цена	269 901 000 белорусских рублей	36 578 000 белорусских рублей
Сумма задатка	26 000 000 белорусских рублей	3 600 000 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск, (017) 227 40 22	

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **8 декабря 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 08.11.2010 по 06.12.2010 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 40 22.

Як падаць заяўку ў Кнігу рэкордаў Гінэса для фіксацыі дасягнення?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

З такім пытаннем у рэдакцыю звярнуўся мінчанін, на ліку якога, паводле яго слоў, 138 выдадзеных за апошнія тры гады ўласных кніг. Толькі ў бліжэйшы час павінны пабачыць свет, удакладніў ён нам, 10 кніг паэзіі, і тады да канца года ў агульным ліку выдадзеных кніг колькасць выданняў з вершамі складзе 92.

Нагадай да жадання зафіксаваць такое

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



Рыпучая засцежка на абутку, сумцы, вопратцы

1		3	9			8	6	
	4		3		6			
			1	8				
	1					9		8
		9				2		
4		7					1	
				6	4			
			5		9		8	
	9	4			2	1		5

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

Muz-news

«J:Морс» зрабілі пародыю з Мікі Руркам

Праўда, сам знакаміты акцёр наўрад ці ў курсе сваіх «беларускіх здымак». Справа ў тым, што кліп на песню «Мамонаў» — высмейванне сучасных кліпмейкерскіх стэрэатыпаў (аголенай натуры, мноства піратэхнікі, галівудскіх зорак і г.д.). Сама ж кампазіцыя — своеасаблівы анонс новага альбома, які гурт плануе выпусціць у лістападзе.

«Мы сабралі ў адным ролiку ўсе штампы паспяховых поп-кліпаў і давялі іх да поўнага абсурду, — прадстаўляе сваё новае «дзіця» рэжысёр Міхей Насарогаў. — Усе танчаць і ўсміхаюцца, а навокал агонь, выбухі, прыгожыя дзяўчаты. Але хапае і самаіроніі: напрыклад, у пэўны момант усе музыканты пераўтвараюцца ў зорак Галівуда... апрануўшы на галаву кардонныя скрынкі з выявамі Бруса Уіліса, Мікі Рурка, Сільвестра Сталонеды іншых знакамітых акцёраў». Таксама нашым адказам Галівуду стаў адмысловы беларускі супермен у выкананні акцёра Новага драматычнага тэатра Сяргея Тоўсцікава. У выніку, як сцвярджае лідар гурта Уладзімір Пугач, усе «і паве-сяліліся, і кліп выдатны знялі». Праверыць апошняе сцвярджэнне можа кожны ахвотны: відэа змешчана на афіцыйным сайце калектыву www.jmors.by. Канцэртная прэзентацыя новага альбома адбудзецца 11 снежня ў сталічным Палацы спорту.

Гурт «Yellow Brick Road» ідзе на рэкорд

26 лістапада беларуская каманда «Yellow Brick Road» прадставіць у Мінску новы альбом «Honeymoon», завяршыўшы гэтым выступленнем ажно трэці (!) свой еўрапейскі тур, які ўключаў два дзясяткі канцэртаў у краінах Прыбалтыкі, у Польшчы, Германіі і Чэхіі. Асаблівай увагі пры гэтым заслугоўвае маленькая рэмарка: гурт існуе ўсяго паўтара года!

Нягледзячы на такі юны ўзрост, мінскія хлопцы, якія спяваюць на англійскай мове і граюць ва ўласным стылі «прагрэсіўны рок-н-рол», паспелі ўжо выпусціць два студыйныя альбомы і тройчы пракаціцца па Еўропе, знайшоўшы сваю публіку. «У Беларусі занадта мала магчымасцяў для выступленняў, менавіта таму многія нашы гурты перастаюць развівацца. Які можа быць прагрэс, калі ў цябе канцэрт раз у некалькі месяцаў і адны і тыя ж калектывы ў праграме? — разважае бас-гітарыст і менеджар гурта Дзмітрый Хламаў. — Трэба браць інструменты і ехаць выступаць, набірацца ўражанняў і вопыту». Назапасіўшы ж таго і другога, музыканты вырашылі нарэшце паказацца і суайчыннікам, прычым абяцаюць зрабіць сапраўднае шоу — з добрым святлом, гукам, відэазапісам і г.д. А ўжо вясной гурт зноў збіраецца ў тур. «За 1,5 года мы сыгралі ў Еўропе больш за 70 канцэртаў. Да свайго двухгоддзя хочам паставіць прыгожы рэкорд — каб колькасць выступаў пераваліла за 100», — раскрывае планы вакаліст Ян Максімовіч.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

МАЛАДЗІК: УСЕ ПЛАНЫ ЎВАСОБЯЦЦА!



Менавіта ў час, калі Месяц пачынае «расці» і трэба пачынаць новыя справы, арганізоўваць сустрэчы з разлікам на далейшыя перспектывы, а таксама здзяйсняць фінансавыя здзелкі. У апошняй жа чвэрці Месяца лепш заканчваць пачатыя справы, а новыя, глабальныя, не пачынаць.
На 9, 15, 19, 23, 29-ты месяцовыя дні лепш за ўсё не падпісваць ніякіх важных дакументаў, дамоў, не ўвязвацца ў рызыкоўныя авантурныя праекты і не ўладкоўвацца на новую працу.
14-ты месяцовы (не прапусціце яго) — выключна важны для пачатку любой важнай справы. Усё пачатае ў гэтыя месяцовыя суткі атрымоўваецца проста бліскуча.
Праяўляць актыўнасць, здзяйсняць хуткія і рашучыя дзеянні неабходна ў вогненных знаках — тады, калі Месяц знаходзіцца ў знаках Авена, Ільва і Стральца.
Месяц у зямных знаках Задыяка (Авен, Дзева, Казярог) спрыяе выкананню практычнай, аналітычнай працы.
Весці важныя перамовы, уладкоўваць сустрэчы і прэзентацыі лепш за ўсё тады, калі Месяц знаходзіцца ў паветраных знаках Задыяка (Блізняты, Шалі і Вадалей).
Месяц у водных знаках Задыяка (Рак, Скарпіён, Рыбы) — гэты выдатны час для творчых людзей, для заняткаў мастацтвам і для дабрачыннай дзейнасці. А цяпер пагаворым больш падрабязна пра гэта.

МЕСЯЦ У АВЕНЕ. Праяўляюцца такія якасці, як паспешнасць, нецярплівасць і імпульсіўнасць. У адносінах шануецца ініцыятыўнасць, адвага і арыгінальнасць. Аднак памятайце пра такт і дыпламатыю. Пачынайце усё, што патрабуе адвагі, рашучасці і хуткасці дзеянняў. Лепш пакінуць на потым дакладныя разлікі і справаздачы. Спрыяльныя кароткія дамовы і паездкі. Не варта займацца справамі, якія не вырашыць адным наскокам. Не варта падпісваць дамовы, складаць кантракты і весці важныя перамовы. Фінансы хутка распыляюцца. Не бярыце шмат наяўнасці, ёсць рызыка адразу ўсё патраціць. Часта — без карысці.

МЕСЯЦ У ЦЯЛЬЦЫ. Характэрныя такія якасці, як запаволенасць рэакцый, няздольнасць хутка вырашаць надзённыя праблемы, флегматычнасць, настойлівасць, упартасць і жаданне больш зарабіць. Мысленне шматлікіх людзей становіцца больш выразным, грунтоўным, але разам з тым прызямлёным і марудлівым. Цялец — знак надзейнасці, устойлівасці, матэрыяльных назапашванняў. Гэтым варта скарыстацца. Таму Месяц у Цяльцы — гэта спрыяльны час для ўладкавання на новую працу, для афармлення фінансавых дамоўленасцяў, для адкрыцця рахунку ў банку. Добры час для вырашэння спраў, звязаных з нерухомасцю, для рашэння маёмасных пытанняў, для карпатлівай працы па любых напрамках: ад сучаснага справаздач да дробнага рамонту.

МЕСЯЦ У БЛІЗНЯТАХ. Выяўляюцца такія якасці, як актыўнасць, унушальнасць, таварыскасць, эмацыйная ўспрымальнасць. У гэты перыяд неабходна працягваць працу над старымі справамі, а за новыя лепш не брацца. Праекты, пачатыя ў дні Блізнят, вельмі часта застаюцца незавершанымі. Вельмі няўдалы час для пачатку рамонту: ён можа зацягнуцца на месяцы. Месяц у Блізнятах — гэта добры перыяд для хуткатэрміновых дзеянняў, перамоў, паездак, камандзіровак, збору любога роду звестак, журналісцкай працы, выступленняў перад аўдыторыяй. Камерцыйная дзейнасць праходзіць вельмі паспяхова, асабліва калі яна не звязана з маёмаснымі, гаспадарчымі і сямейнымі справамі. Негатыўны ўплыў Месяца ў Блізнятах звязаны з тым, што людзі не ў стане засяроджана і паглыблена займацца якім-небудзь адным відам дзейнасці. Ім хочацца ўвесь час кідацца з аднаго на іншае, складана ўседзець на месцы, таму магчымыя паспешныя дзеянні. А яны звычайна неэфектыўныя.

МЕСЯЦ У РАКУ. Для гэтага перыяду характэрныя адчувальнасць, сентыментальнасць, эмацыйная няўстойлівасць, замкнёнасць. Месяц у Раку спрыяе правядзенню аперацый з нерухомасцю, антыкварыятам. Абяцаюць удалага завяршэння пачатыя тым часам судовыя справы. Гэта добры час для правядзення рэкламных кампаній і марскіх вандраванняў. Але не варта займацца новабудоўляй, пазычаць камусьці грошы, складаць кантракты.

МЕСЯЦ У ЛЬВЕ. Упэўненасць у сабе, красамоўства, баявы дух, выдатны настрой.... Усё гэта добра. Але трэба ведаць, што ў такі перыяд павялічваецца схільнасць да рызыкі. Гэтыя дні ідэальныя для правядзення прэзентацый, для культурных, спартыўных і іншых масавых мерапрыемстваў. Можна схадзіць да начальства і запатрабаваць павышэння зарплаты ці проста наладзіць больш цесныя ўзаемаадносіны са сваім шэфам. Абавязкова выкарыстоўвайце гэты час: энергія б'е ключом цераз край, знайдзіце ёй годнае ўжыванне. Але пры Месяцы ў Льве не варта афармляць грашовыя дакументы і дагаворы, трэба адкласці і справы з нерухомасцю.

МЕСЯЦ У ДЗЕВЕ. Праяўляюцца такія якасці, як практычнасць, пунктуальнасць, адказнасць, уважлівасць, рацыянальнасць, акуратнасць, асцярожнасць. У той жа час слаба працуе інтуіцыя. Гэта самы лепшы час для выканання работы, якая патрабуе вялікай дакладнасці і засяроджанасці — ад бухгалтарскай дзейнасці і складання рознага роду справаздач да тонкай, ювелірнай працы. Можна афармляць грашовыя дакументы, іншыя каштоўныя паперы, вэксалі, банкаўскія рахункі. Карысць прынясе вучоба. Поспех чакаецца ва ўсім, што звязана з навуковай работай, складанымі матэматычнымі разлікамі, вылечальнай тэхнікай. Не варта тым часам прымаць важныя рашэнні і займацца разборам глабальных пытанняў. Для гэтага нам не хапае інтуіцыі — здольнасці прадбачыць усе нюансы.

МЕСЯЦ У ШАЛЯХ. Гэта перыяд стабільнасці ў настроі, нерашучасці, схільнасць да ваганняў. Змяншаецца верагоднасць канфліктаў. Месяц у Шалях дае настрой на спакой і гармонію. Выдатны час для перамоў і сустрэч, якія патрабуюць дыпламатычных якасцяў. Варта часова адкласці прынятае важных рашэнняў. У гэтыя дні лепш займацца справамі, якія патрабуюць хуткага завяршэння, якія павінны быць хутка аформлены і гэтак жа хутка скончаны.

МЕСЯЦ У СКАРПІЁНЕ. У гэтыя дні праяўляюцца такія якасці, як раздражняльнасць, агрэсіўнасць, нервовасць, нецярплівасць, схільнасць да дэпрэсій. Старайцеся менш кантактаваць з начальствам, паход да яго лепш адкласці. Партнёрскія сустрэчы лепш таксама звесці да мінімуму. Месяц у Скарпіёне — гэта лепшы перыяд для прыняцця самых рызыкоўных, самых сур'ёзных рашэнняў. Але не варта пачынаць новыя справы, брацца за новыя абавязкі, мець справы з нерухомасцю.

МЕСЯЦ У СТРАЛЬЦУ. Выяўляецца схільнасць да стабільнасці і парадку. Людзі становяцца больш спакойнымі і законапаслухмянымі. Павялічваецца цікавасць да грамадскай дзейнасці. Гэта адзін з лепшых перыядаў для заняткаў прававымі пытаннямі, для вырашэння юрыдычных праблем. Можна пачынаць новыя справы, паспяхова пройдуць далёкія паездкі і камандзіроўкі. Не рэкамендуецца займацца справамі, звязанымі з зямлёй ці будаўніцтвам.

МЕСЯЦ У КАЗЯРОГУ. Для яго характэрныя адказнасць, рацыянальнасць, практычнасць, абвастраецца пачуццё абавязку, але ў адначасова павялічваецца абыякавасць і нават жорсткасць. Логіка працуе выдатна. Гэта неспрыяльны час для творчых людзей, для таго, хто звязаны з мастацтвам. Адначасова добра выконваецца работа, якая патрабуе дакладнасці, матэматычных разлікаў, строгага прытрымлівання інструкцый. Спрыяльны час для спраў з нерухомасцю, для пачатку важнай і сур'ёзнай навуковай працы. А вось у грашовых пытаннях магчымыя затрымкі і страты. Адкрыцця новых фінансавых магчымасцяў чакаць не даводзіцца. Не ўладкоўвайцеся на новую працу, не бярыце і не давайце ў доўг.

МЕСЯЦ У ВАДАЛЕІ. Праяўляюцца такія якасці, як прага незалежнасці, экстравагантнасць, таварыскасць, схільнасць да эксперыментаў, вынаходлівасць. Гэта час шанцавання. Добра пройдуць розныя новаўвядзенні, пераўтварэнні, авантурныя праекты. Спрыяльны перыяд для заняткаў навуковай дзейнасцю, даследаваннямі, выступленняў перад шырокай публікай. Не рэкамендуецца звяртацца да начальства і наогул наведваць дзяржустановы.

МЕСЯЦ У РЫБАХ. Вас апануе сентыментальнасць, эмацыйнасць, адчувальнасць, абвастрыцца інтуіцыя. Гэта выдатны час для творчых людзей, для пошуку фундатараў і дабрачыннай дзейнасці. Не час для разумовай дзейнасці: у вашых разліках могуць быць памылкі, думкі лунаюць дзесьці высока, праяўляецца цяга да фантазёрства, трацицца канкрэтыка. Справы, звязаныя з капіталаўкладаннем, ідуць не вельмі дрэнна; добра вырашаюцца юрыдычныя праблемы, можна пачынаць судовыя працэсы. Магчымы рост прыбыткаў у выніку прадуманых дзеянняў. Можна браць у доўг, афармляць крэдыт.

Вось што раіць нам Месяц. Спадзеючыся на яго, не губляйцеся і самі. І тады ўсё будзе добра!

Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 6 лістапада.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.17	16.28	9.11
Віцебск —	7.11	16.13	9.02
Магілёў —	7.07	16.18	9.11
Гомель —	6.59	16.20	9.21
Гродна —	7.32	16.44	9.12
Брэст —	7.28	16.50	9.22

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Емяльяна, Ігната, Мікалая, Уладзіміра, Якава.*

К. *Альжбеты, Захара, Славаміра, Яўгена.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

5 лістапада

1939 год — у Дзяржаўным тэатры оперы і балета Беларусі адбылася прэм'ера першага беларускага нацыянальнага балета «Салавей». Лібрэта балетнага спектакля па аднайменным творы З. Бядулі напісалі Ю. Слонімскі і А. Ермалаеў, а музыку — М. Крошнер. Спектакль з захапленнем успрынялі гледачы, ён атрымаў заслужанае прызнанне крытыкі. У 1940 годзе на Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве «Салавей» быў з поспехам прадэманстраваны маскоўскай публіцы.

1484 год — папа рымскі Інакенцій VIII выдаў булу супраць ведзьмаў, якая паклала пачатак масавому спальванню на вогнішчы па ўсёй Еўропе.

«Жаданне выказацца амаль заўсёды бывае больш моцным, чым жаданне таму-небудзь навучыцца».

Дзмітрый Пісараў (1840—1868), рускі публіцыст і літаратурны крытык.

ВЭЛЮМ ЯК «ЭСТАФЕТА» ЗАМУЖЖА

У вясельным строі нявесты адным з галоўных атрыбутаў быў галаўны ўбор з вянка і вэлюму. Адразу ж пасля дзялення каравая маці жаніха падыходзіла да маладой, здымала з нявесты вэлюм і павязвала атрыбуты жаночай долі: хустку і фартух.

● Вэлюм браў у рукі шафер, апранаў на галаву шаферцы. Тая, у сваю чаргу, павінна была тройчы павярнуцца вакол сябе. У некаторых мясцовасцях гэтыя абрадавыя дзеянні выконвала сама нявеста. Гэты рытуал сімвалізаваў перадачу жыццёвай эстафеты: меркавалася, што менавіта шаферка наступнай павінна выйсці замуж. Пасля вэлюм перадавалі іншым дзяўчатам — удзельніцам вяселля. Яны паўтаралі рытуал, які толькі што выканала першая шаферка. Затым маці жаніха забірала вэлюм і вешала яго ў чырвоны кут пад абраз.

● Народная традыцыя раіла: нікому з блізкіх сваякоў, сяброў ці сябровак вэлюм не перадаваўся, нават ад старэйшай сястры малодшай. Маці магла перадаць вэлюм сваёй дачцэ пры адной умове: калі вяселле дачкі адбудзецца пасля таго, як бацькі адсвяткуюць сваё сярэбранае вяселле.

● Парадаксальна сёння выглядае сітуацыя, калі жанчына, выходзячы замуж ужо ў другі ці трэці раз (нават пры ўмове, што ад першага шлюбу ў яе не было дзяцей), надзявае вэлюм. Яна не мае маральнага права пакрываць галаву абрадавым атрыбутам цнатлівай нявесты. У храме падчас шлюбу жанчына абавязкова павінна знаходзіцца ў галаўным уборы, але для гэтага трэба выкарыстоўваць іншыя рэчы (капялюшык, хустку і т.п.).

● Яшчэ адзін атрыбут — букет, які ўручае жаніх нявесце пры сустрэчы ў першы дзень вяселля. Калі нявеста хоча захаваць каханне мужа на доўгія гады, не варта букет «выкідваць» — кідаць незамужнім дзяўчатам! Паводле этнаграфічных запісаў XIX-XX стст., гэты букет нявесты акуратна высушвала і зашывала ў падушку, тым самым назаўжды «прывязваючы» мужа да сям'і, хаты, дзяцей.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Віншуем з 25-годдзем дачушку **Алену ДУБАНЕВІЧ** з Мінска. Здароўя, шчасця, надзейных сяброў.

Бацькі.

Віншуем **Сашу УРБАНА** з днём нараджэння. Жадаем здароўя, кахання. Усіх табе даброт.

Бацькі. *Нясвіж.*

Экслібрыс «Звязды»

КАМЕРТОН ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

Марціновіч, А.А.

Пяшчота апалага ліслця: эсэ, нарысы/ Алесь Марціновіч. — Мінск: Маст.літ., 2010. — 334 с. — (Гісторыя ў асобах).

Ці шмат што вы чулі пра Скрэву — легендарную ці напаўлегендарную скіфскую царэўну з VII стагоддзя да нашай эры? Якія факты ці меркаванні можна выкласці ў дачыненні да гэтай гістарычнай асобы? Які лёс напаткаў палачанку Аляксандру Брачыславаўну — жонку Аляксандра Неўскага? Якую ролю ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага адыграла княгіня-вайдэлотка Бірутэ, якой у Літве прысвечаныя многія кнігі, а ў цэнтры горада Паланга стаіць яе помнік?.. Разам з пісьменнікам Алесем Марціновічам адказы на гэтыя і многія іншыя гістарычныя пытанні можна знайсці ў яго кнізе «Пяшчота апалых лісцяў». Выдадзены ў серыі «Гісторыя ў асобах», зборнік гэты з'яўляецца працягам тае бібліятэкі выданняў, якія літаратар прысвяціў розным персанажам айчыннай гісторыі. Займаючыся стварэннем партрэта Беларусі праз жыццяпісы славутых сыноў і дачок, за апошнія два дзесяцігоддзі Алесь Марціновіч надрукаваў амаль 300 грунтоўных, багатых на фактаграфічны матэрыял, нарысаў.

У новай кнізе «Пяшчота апалага ліслця» чытача чакаюць сустрэчы са згаданымі Скрэвай, Аляксандрай Брачыславаўнай, вайдэлоткай Бірутэ, а таксама з Аўрамам Весялоўскім, Антоніем Тызенгаўзам, Іосіфам Аляшкевічам, Адамам Сузіным, Зыгмунтам Урублеўскім і іншымі беларусамі і ўраджэнцамі Беларусі. «Адчуўшы ж лучнасць свайго лёсу з іншымі лёсамі, — піша ў прадмове да кнігі Алесь Марціновіч, — хочацца болей даведацца пра іх. І гэтае жаданне — не простая памяць, як можа падацца на першы погляд, а нешта больш важнае і значнае, што патрапляе пад вызначэнне гістарычная памяць, а без яе, гэтай гістарычнай памяці, нельга жыць усвядомлена і паўнакроўна, калі не хочаш заставацца ў сваім жыцці манкуртам, бо яна — той чуйны камертон, дзякуючы якому спасцігаюцца даўнія і больш блізкія стагоддзі, як бы праламаныя ў лёсах тых, хто сваімі дзеяннямі і ўчынкамі заслужыў , каб пра яго ведалі і памяталі».

Мікола БЕРЛЕЖ.

Усміхнемся!

Двор, балконы насупраць, вечар, дзве суседкі.
— Твой прыйшоў?
— Не, каб ён здох, а твой?
— А мой прыйшоў, каб ён здох побач з тваім!

☺

Маці — дачцэ:
— Гэты твой прыхільнік мне так не падабаецца, што я з задавальненнем стану яго цешчай!

☺

Бяжыць Калабок па лесе, а насустрач яму Ліса:
— Матай адгэтуль, хлебабулачнае, я на дыеце!

☺

Жанчынам трэба ўвага. Увага, цяпер будзе сэкс!
Мужчыну трэба разумненне. Сэксу не будзе, зразумела?!

☺

Метро, гадзіна пік.
— Дзяўчына, калі вы не перастанеце так на мяне напіраць, дык я, як сумленны мужчына, павінен буду з вамі ажаніцца!

☺

— Чуў? Вася выпіў правільнага піва і быццам нанова нарадзіўся!
— Што, пахмелля зусім не было?
— Не! Плакаў, пісаўся, размаўляць не мог...

«Гибридная почта»
- это комплексная услуга
для корпоративных клиентов по распечатке, конвертованию и рассылке информации, полученной от поставщика услуг в электронном виде.
Вам необходимо:
-распечатать информацию?
-упаковать ее в конверты?
-напечатать адреса получателей?
-отправить по назначению?
Вы хотите:
- снизить расходы на обработку исходящей корреспонденции?
- повысить скорость доставки отправления?
- получить гарантию надежности доставки отправлений?
Обращайтесь в РУП «Белпочта»!
Дополнительную информацию Вы можете получить по телефону 8 017 222 72 07

НОВАЯ УСЛУГА
РУП «Белпочта» предлагает отечественным производителям разместить информацию о товарах в каталоге товаров белорусских производителей.
КАТАЛОГ ТОВАРОВ БЕЛОРУССКИХ ПРОИЗВОДИТЕЛЕЙ 2010
Сеть отделений почтовой связи, в которых будут размещены каталоги и реализованы товары, составляет более 3700 отделений почтовой связи по всей Республике Беларусь.
Покупатель имеет возможность оформить заказ на товар из каталога в любом отделении почтовой связи РУП «Белпочта». Сформированный заказ на товар производитель направляет почтовым отправлением с наложенным платежом по адресу, указанному покупателем.
При получении почтового отправления с товаром покупатель оплачивает сумму наложенного платежа (стоимость товара) и пересылку перевода наложенного платежа.
Сумма денежного перевода перечисляется на расчетный счет производителя.
По вопросам предоставления услуги, Вы можете получить консультацию по телефону: (017) 227-60-64; (017) 227-30-55.
Ждем Вас в отделениях почтовой связи!
Приглашаем белорусских производителей к сотрудничеству!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), І. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5395. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12